

«СТВАРЭННЕ ПЕСНІ – ЯК НАРАДЖЭННЕ ДЗІЦЯЦІ» ЧЫРВОНКА

ЯК «ДОЙЛІДЫ» СКАРЫЛІ КУЗБАС ЧЫРВОНКА




Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

30 ВЕРАСНЯ 2021 г. ЧАЦВЕР № 188 (29557)


## ЦЫТАТА ДНЯ



**Аляксандр ТАРАСЕНКА, намеснік міністра аховы здароўя — галоўны дзяржаўны санітарны ўрач:**

*«Калі казаць пра ролю санэпідслужбы ў забеспячэнні здароўя насельніцтва, то неабходна адзначыць, што цяпер, як і пры першай хвалі, мы па-ранейшаму праводзім эпідрасследаванне: вызначаем крыніцы каранавіруснай інфекцыі, знаходзім кантакты першага ўзроўню і перарываем ланцужкі распаўсюджвання. У ачагах праводзяцца супрацьэпідэмічныя мерапрыемствы. Займаемся і мерапрыемствамі прафілактычнага характару, каб папярэдзіць групавыя масавыя захворванні. Гэта маніторынгі на прадпрыемствах, у арганізацыях, установах, у ходзе якіх відаць, дзе яны недапрацоўваюць. Але гэта не значыць, што мы толькі рэкамендуем. Пры сістэматычным невыкананні нашых патрабаванняў і рэкамендацый вінаватыя прыцягваюцца да адміністрацыйнай адказнасці».*

# ДА ХУТАРА — НА СКУТАРЫ



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Таіса Міхайлаўна БАЗІЛЬЧУК, пенсіянерка з вёскі Амбросенкі Шаркаўшчынскага раёна, прыехала на хутар Галава, дзе яе сустракаюць сын Аляксандр і ўнучка Кацярына. Болей за дзесяць гадоў Таіса Міхайлаўна, былая паштальёнка, кіруе скутарам. Цікавы момант: больш чым 40 гадоў яна выпісвае і чытае газету «Звязда».

## КОРАТКА

- **Уцекачам з Афганістана на лініі беларуска-польскай граніцы перадалі гумдапамогу ад БСЖ.**
- Музычны сезон у БДАМ адкрыецца канцэртам памяці Дзмітрыя Шастаковіча.
- **Экспазіцыя аб партызанах Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны будзе працаваць у Мінску 30 верасня.**
- Праект закона аб унясенні змяненняў у Кодэкс аб культуры вынесены на абмеркаванне.
- **У Полацку абмеркавалі падрыхтоўку да святкавання 900-годдзя Спаса-Еўфрасіннеўскага манастыра.**


ISSN 1990 — 763X


На тэму дня

## АЎТАМАБІЛЬНЫ ПАДАТАК: КАМУ ПЛАЦІЦЬ, КОЛЬКІ І КАЛІ



**Пытанне платы так званага транспартнага падатку фізічнымі асобамі ці, проста кажучы, аўтаамататарамі, ужо некалькі гадоў востра стаіць на парадку дня. Абмяркоўвалася шмат варыянтаў яго магчымага вырашэння. Выказваліся і эксперты, і дэпутаты, і міністры, і падаткавікі. Але доўгі час не сыходзіліся. І толькі ў пачатку гэтага года пытанне зрушылася з мёртвай, што называецца, кропкі.**

Такім чынам, з 1 студзеня замест дзяржпошліны за выдачу дазволу на допуск транспартнага сродку да ўдзелу ў дарожным руху ўведзены транспартны падатак. Яго будуць выплачваць усе ўласнікі транспартных сродкаў, зарэгістраваных у базе ДАІ МУС. Падатак будзе спаганяцца за год, зыходзячы з фізічных параметраў аўто і фактычнага часу валодання транспартным сродкам. Не будуць прызнавацца аб'ектам падаткаабкладання транспартныя сродкі, выпушчаныя не пазней чым 1991 года або звесткі пра год выпуску якіх адсутнічаюць.

СТАР. 3

По родным краі

## КРЫНІЦА ЎРАЖАННЯЎ,

### або Прарыў ва ўнутраным турызме

**Нягледзячы на пандэмію, гэты год аказаўся даволі ўдалы для ўнутранага турызму. І, відаць, справа не толькі ў тым, што ў летнім сезоне беларусам шанцавала з надвор'ем і яны актыўна выбіраліся за межы сваіх населеных пунктаў. Спрацавала і «цыганская пошта»: вандроўнікі, якія пачалі адкрываць для сябе Беларусь, актыўна дзяліліся інфармацыяй праз сацыяльныя сеткі. Здзіўляліся, як многа цікавага і карыснага можна даведацца ў падарожжах па родным краі, і наколькі якасныя і цікавыя турпрадукты ўжо створаны ў розных рэгіёнах.**

СТАР. 4



# НА ЛІНІІ АГНЮ

## Пры выкананні сваіх службовых абавязкаў быў забіты супрацоўнік КДБ

### «БЕСПАКАРАНЫМ ГЭТА НЕ ЗАСТАНЕЦЦА»

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка спачувае і суперажывае родным і блізкім загінулага напярэдадні ў Мінску супрацоўніка Камітэта дзяржбяспекі. Пра гэта заявіла журналістам прэс-сакратар кіраўніка дзяржавы Наталля Эйсмант, паведаміла БелТА.**

Яна адзначыла, што трагедыя адбылася падчас пашыранага пасяджэння Канстытуцыйнай камісіі, у якім прымаў удзел Аляксандр Лукашэнка. «Мерапрыемства якраз завяршалася. У цяперашняй сітуацыі інфармаванне Прэзідэнта пастаўлена на такі ўзровень, што ўжо праз дзве-тры хвіліны пасля таго, як пачуліся стрэлы, кіраўніку дзяржавы далажылі аб тым, што адбылося», — расказала прэс-сакратар.

Па даручэнні Прэзідэнта на месца здарэння выехаў кіраўнік КДБ і праз гадзіну кіраўніку дзяржавы ўжо другі раз дэталёва было далажана аб усіх абставінах трагедыі. «Спробы ў літаральным сэнсе падарваць сітуацыю ў Беларусі не спыняюцца, і пра гэта яшчэ далёка не ўсё сказана. Атрымаўшы інфармацыю пра чарговую пагрозу, адпаведныя службы правяралі і адпрацавалі яе», — адзначыла Наталля Эйсмант.

Яна заявіла, што па выніках дакладаў кіраўнік дзяржавы даручыў аказаць усялякую падтрымку і дапамогу сям'і загінулага, яго бацькам. «Прэзідэнт вельмі спачувае і суперажывае родным і блізкім гэтага хлопца», — сказала прэс-сакратар.

Напярэдадні таксама было даручана самым дбайным чынам разабрацца ў абставінах здарэння. «Асобна хачу вылучыць наступныя словы Прэзідэнта: « Рэакцыя на тое, што адбылося, будзе імгненнай і самай жорсткай. Беспакараным тое, што здарылася ўчора, не застанецца», — рэзюмавала Наталля Эйсмант.

**Увечары ў аўторак у ходзе правядзення працэсуальных дзеянняў, якія былі санкцыянаваныя адным з намеснікаў генпракурора, быў забіты супрацоўнік Камітэта дзяржаўнай бяспекі Беларусі.**

***Усе, хто загуляўся ў «рэвалюцыю» тут і за мяжой, адкажуць перад законам.*** Пра гэта заявіў **кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Беларусі Ігар СЕРГЕЕНКА**. «У ходзе правядзення спецыяльных мерапрыемстваў па барацьбе з тэрарызмам і экстрэмізмам пры выкананні службовага абавязку загінуў супрацоўнік Камітэта дзяржаўнай бяспекі. Здарылася трагедыя. Мы смуткуем разам з роднымі і блізкімі», — сказаў Ігар Сергеенка.

Кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта падкрэсліў: «Ад імя кожнага, хто абараняе мір і забяспечвае бяспеку грамадзян, ад імя жыхароў нашай краіны, якія нясуць кветкі і запальваюць лампады каля месца прагы загінулага і іншых памятных месцаў, я звяртаюся да тых, хто перайшоў чырвоную лінію. Папярэджваю вас, уласнікі крам, дзе, як вядома, прадаюцца так званыя баявыя лісткі, якія прапагандуюць экстрэмізм, гвалт і злачыннасць, зларадныкі, якія называюць сябе журналістамі, і ўсе тыя, хто загуляўся ў «рэвалюцыю» тут і за мяжой, — адкажаце перад законам. Нават не спрабуйце зачышчаць свае акаўнты ў сацыяльных сетках. Усе, хто ўбачыў у злачынцы сакральную ахвяру, хто пераступіў праз слёзы чатырохгадовага дзіцяці, хто зрабіў хайп на горы сям'і афіцэра, будуць знойдзены. Сёння вы паказалі свой сапраўдны твар: беспрынцыпны, подлы і амаральны. Вы сталі ў адзін шэраг са злачынцамі і іх памагатымі. Выбар зроблены. Гэтаму няма прабачэння, гэтаму няма апраўдання».

«Санкцыі былі дадзены на правядзенне шэрагу працэсуальных дзеянняў, звязаных з праверкай асоб на дачыненне да тэрарызму і экстрэмізму, — растлумачыў **Генеральны пракурор Беларусі Андрэй ШВЕД**, паведаміла БелТА. — Падчас правядзення вобыску ў адным з жылых памяшканняў асоба, якая падазраецца ў датычнасці да тэрарызму, наўмысна, мэтанакіравана зрабіла стрэл у супрацоўніка праваахоўных органаў, смяротна яго параніўшы. Агнём у адказ асабліва небяспечны злачынца быў знішчаны. Мы правялі праверку гэтых абставінаў і прыйшлі да адназначнай высновы, што праваахоўнікі дзейнічалі строга ў рамках закона, адэкватна з абставінамі», — адзначыў генпракурор.

«На законныя патрабаванні супрацоўнікаў праваахоўных органаў 31-гадовы жыхар Мінска адмовіўся адчыніць дзверы кватэры і заблакіраваўся ў ёй. Для наступнага так званага хайпу рабіў відэаздымкі. Пасля пранікнення ў кватэру супрацоўнікаў мужчына адкрыў агонь з паляўнічай стрэльбы ў бок праваахоўнікаў», — расказалі падрабязнасці ў аддзеле інфармацыі і сувязі з грамадскасцю Следчага камітэта. Яго 40-гадовая жонка, якая таксама правадзіла відэаздымку злачынства і садзейнічала яго здзяйсненню, затрыманая па падазрэнні ў саўдзеле ў забойстве супрацоўніка КДБ.

Галоўнае следчае ўпраўленне Следчага камітэта па факце забойства супрацоўніка Камітэта дзяржаўнай бяспекі ўзбудзіла крымінальную справу па п. 10 ч. 2 арт. 139 (забойства асобы ў сувязі з ажыццяўленнем ёй службовай дзейнасці) КК. Працягваецца правядзенне неадкладных следчых дзеянняў і аператыўна-вышуковых мерапрыемстваў, у тым ліку накіраваных на высвятленне асоб, якія маюць дачыненне да здзяйснення злачынства. Прызначаны судова-медыцынскія, комплексная крыміналістычная балістычная і іншыя экспертныя даследаванні.

«Акрамя гэтага, хацелася б адзначыць, што ў загінулага супрацоўніка 1990 года нараджэння засталіся жонка і малалетняе дзіця, — дадалі ў ведамстве. — Асабліва адзначаем, што па кожным факце ціску, пагроз і спроб іх ажыццяўлення ў дачыненні да супрацоўнікаў праваахоўных органаў, грамадзян, якія выконваюць грамадскі абавязак, іх блізкіх Следчы камітэт сумесна з іншымі праваахоўнымі органамі, як і раней, будзе даваць жорсткую і прынцыповую прававую ацэнку. Вінаватыя ў супрацьпраўных праявах у дачыненні да службовых асоб будуць устаноўлены і прыцягнуты да прадугледжанай законам адказнасці».

Андрэй Швед заявіў, што забойства супрацоўніка КДБ з'яўляецца беспрэцэдэнтным выпадкам. «Мы неадназова казалі пра тое, што ідзе радыкалізацыя дзеянняў з боку асоб, якія пасягаюць на суверэнітэт нашай дзяржавы, грамадскую бяспеку», — падкрэсліў Андрэй Швед. Паводле яго слоў, гэты выпадак яшчэ раз пацвярджае: прынцып няўхільнасці пакарання — гэта той краевугольны камень, на якім будуецца работа ўсіх праваахоўных органаў. ***«Ніводны злачынца не сыдзе ад адказнасці, якое б злачынства ён ні здзейсніў»***, — адзначыў генпракурор. Ён заўважыў, што падобнага роду выпадкі падштурхоўваюць праваахоўны блок да большай кансалідацыі, канцэнтрацыі намаганняў, актывізацыі работы па спыненні такіх злачынстваў. «З боку Генпракуратуры мы будзем рабіць усё неабходнае, каб гэтыя дзеянні былі жорсткія, рашучыя і ў рамках закона», — падкрэсліў ён.

**Пётр ДУНЬКО.**

# ЗАМАХ НА ЎСІХ НАС

**«Нахабнае і цынічнае забойства супрацоўніка КДБ кажа пра тое, што заходнія цэнтры, якія планавалі дзяржаўны пераварот у краіне, пасля няўдалай рэвалюцыі робяць стаўку на тэрарызм, экстрэмізм і інструмент санкцый. Санкцыі павінны падштурхнуць тэрарыстычную, экстрэмісцкую дзейнасць, на іх погляд. І пачынаецца фінансаванне гэтай дзейнасці. Усе спробы замахаў, забойстваў, зброя, якая знаходзіцца ў Беларусі, — ужо даказана, што фінансаванне ідзе з-за мяжы. Гэта значыць, стаўка будзе рабіцца на гэта», — перадае БелТА словы намесніка старшыні Пастаяннай камісіі па міжнародных справах Палаты прадстаўнікоў Алега Гайдукевіча.**



Фота БелТА.

Дэпутат адзначае, што неабходна прыцягнуць да адказнасці ўсіх, хто мае дачыненне да трагедыі.

«Усіх, хто знаходзіцца за мяжой. Тых, хто на працягу ўсяго часу заклікаў да гэтага, фінансаваў, арганізоўваў, — сцвярджае ён. — Парламент ужо зрабіў першы крок. Мы ўнеслі законапраект аб адказнасці за санкцыі. Зараз адкрываецца восеньская сесія. Я перакананы, што мы павінны яшчэ больш узмацніць адказнасць».

У Год народнага адзінства мы павінны разам процідзейнічаць тэрарыстычнай пагрозе, заявіў палітолаг Вадзім Баравік. «Мы разумеем, што такімі крокамі разбураецца мір у краіне, калі чалавек пры выкананні сваіх абавязкаў гіне. Сям'я губляе бацьку, краіна — афіцэра, які сумленна служыў. Уся Беларусь смуткуе. Мы бачым, што людзі нясуць лампады, кветкі да будынка КДБ, — сказаў Вадзім Баравік. — Мы павінны сёння разумець, што сутыкаемся з тэрарыстычнай пагрозай унутры краіны, паколькі ёсць шэраг асоб, якія ўжо абсалютна грэбуюць законам. Бо чалавек са зброяй чакаў праваахоўнікаў і выкарыстаў яе першы на паражэнне. Яму нічога не пагражала».

Заходнія спецслужбы стымулююць і развіваюць у Беларусі і Расіі тэрарыстычны рух. Пра гэта ў эфіры тэлеканала «Беларусь 1» заявіў расійскі палітолаг, радыё- і тэлевядучы Сяргей Міхееў, каментуючы гібель супрацоўніка КДБ. Паводле яго слоў, ім важна, каб у нашых краінах з'явіўся тэрарысты. «Ім важна, каб пачалася сапраўдная вайна, крывавыя сутыкненні, таму што гэта ім на руку», — дадаў аналітык.

Пры гэтым экстрэмісцкія рэсурсы гатовыя апраўдаць любыя злачынствы па палітычных матывах. Такое меркаванне выказаў дэпутат Палаты прадстаўнікоў Сяргей Клішэвіч. «На працягу 3-4 гадзін радыкальныя інфармацыйныя рэсурсы былі пераарыентаваны на гераізацыю злачынцы, ствараючы не так званай сакральнай ахвяры. Як і раней, каардынатарам медыйнай кампаніі неабходна дыскрэдытаваць работу сілавых структур. Для гэтых мэт у інфармацыйную прастору была хутка ўкінута вялікая колькасць інфармацыі пра асобу злачынцы, яго станоўчыя характарыстыкі, сацыяльныя сувязі. Тым самым яны спрабуюць справакаваць максімальнае суперажыванне ў мэтавай аўдыторыі, а ў перспектыве — новую спробу эскалацыі пратэстаў», — адзначыў дэпутат.

Паводле яго слоў, прэцэдэнт таксама выкарыстоўваецца для прамога апраўдання падрыўной, тэрарыстычнай, экстрэмісцкай дзейнасці, яе рамантызацыі, уключэння ў яе новых удзельнікаў. «Лічу , што тыя інфармацыйныя рэсурсы, якія працягваюць дзейнасць з тэрыторыі Беларусі альбо захавалі тут карэспандэнцкія сеткі, інфарматараў, рэшткі рэдакцый, павінны быць цалкам ліквідаваны. У дадзеным канкрэтным выпадку яны фактычна апраўдваюць тэрарыстычную дзейнасць», — лічыць Сяргей Клішэвіч.

Адбылася крайняя ступень маргіналізацыі актывістаў пратэснага руху, які з канца мінулага года страціў падтрымку мас. Такім меркаваннем з у сваім Telegram-канале падзяліўся палітычны аналітык Аляксандр Шпакоўскі. Ён падкрэсліў, што «ў шэрагах «актывістаў» засталіся самыя экзальтаваныя адэпты, якія страцілі арыенціры дабра і зла, а таксама пачуццё самазахавання». Па словах аналітыка, такія людзі гатовыя да здзяйснення любых злачынстваў аж да шпіянажу і палітычных забойстваў. Іх колькасць параўнальна невялікая, але дастаткова для арганізацыі сеткі самастойных ячэек. «Асабліва імкнуцца ў дачыненні да стварэння бандподполля ў Беларусі розныя дыяспаральныя арганізацыі, якія знаходзяцца пад шчыльнай апекай заходніх спецслужбаў, і ўкраінская ваенная разведка. Мірнага жыцця нашай краіне не дадуць. Давядзецца прывыкаць дзейнічаць у рэжыме мабілізацыі, часам жорсткай. Іншага выйсця на найбліжэйшы час не праглядаецца», — рэзюмаваў Аляксандр Шпакоўскі.

Забойства супрацоўніка КДБ стала апафеозам экстрэмізму для ўсяго беларускага народа. Такім меркаваннем з БелТА падзяліўся загадчык аддзела сацыялогіі дзяржаўнага кіравання Інстытута сацыялогіі НАН кандыдат філасофскіх навук Мікалай Шчокін. Жудаснае злачынства «адкрыла сапраўдны твар здраднікаў-тэрарыстаў, нягоднікаў, злачынцаў, якія хаваюцца за мяжой, і тых, хто іх хавае і фінансуе», адзначыў аналітык.

Паводле яго слоў, так званая апазіцыя прабіла маральнае дно. "Час паказаў, што трэба прымаць самыя жорсткія і бескампрамісныя меры па спыненні любых спроб тэрарыстычных пагроз. Гэта забойства не проста супрацоўніка, патрыёта, грамадзяніна сваёй Радзімы — гэта замах на ўвесь беларускі народ, на кожнага з нас, — упэўнены Мікалай Шчокін. — Няўжо і пасля гэтага хтосьці адважыцца казаць аб прасоўванні дэмакратычных каштоўнасцяў? Усіх датычных варта без тэрміну даўнасці шукаць, вылоўліваць і публічна судзіць. Светлая памяць афіцэру дзяржбяспекі, нізкі паклон бацькам і сваякам. Прабачце нас, што не зберагліі».

# АЎТАМАБІЛЬНЫ ПАДАТАК: КАМУ ПЛАЦІЦЬ, КОЛЬКІ І КАЛІ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Як паведамляецца на сайце МПЗ, выплата транспартнага падатку плацельшчыкамі — фізічнымі асобамі — робіцца за мінулы каляндарны год на падставе паведамлення падатковага органа, які ўручаецца такому плацельшчыку не пазней за 1 верасня года, наступнага за папярэднім. Заканадаўча цяпер устаноўлены тэрмін аплаты — 15 лістапада года, наступнага за мінулым годам.

Пры гэтым 2021 год з'яўляецца пераходным для ўкаранення сістэмы збірання транспартнага падатку. Ёсць асаблівасці для асобных плацельшчыкаў.

Так, фізічныя асобы, якія не атрымалі на 1 студзеня 2021 года ва ўстаноўленым парадку дазвол на допуск транспартнага сродку да ўдзелу ў дарожным руху, абавязаны выплаціць не пазней за 15 снежня 2021 года авансавы плацеж у памеры адной базавай велічыні, а за прычэп, прычэп-дачу (караван) і матацыкл — у памеры 20 рублёў за кожны аб'ект падаткаабкладання. Паведамленне на такія плацяжы будзе накіравана падатковым органам не пазней за 1 лістапада гэтага года. Ім таксама трэба будзе зрабіць даплату транспартнага падатку за 2021 год не пазней за 15 лістапада 2022 года на падставе паведамлення падатковага органа, якое будзе ўручана не пазней за 1 верасня 2022 года.

Як паведамляецца на сайце ведамства, уладальнікі транспартных сродкаў павінны аплаціць авансавы плацеж па транспартным падатку не пазней за 15 снежня. Таксама ведамства нагадвае, што плацельшчыкамі авансавага плацяжу за 2021 год прызнаюцца фізічныя асобы, за якімі па стане на 1 студзеня 2021 года зарэгістраваныя транспартныя сродкі, што не прайшлі тэхагляд.

Выплата авансавага плацяжу робіцца на падставе паведамлення падатковага органа, якое будзе накіравана на адрас фізічных асоб па пошце альбо ў асабісты кабінет плацельшчыка не пазней чым 1 лістапада 2021 года.

Тэрмін выплаты авансавага плацяжу — не пазней за 15 снежня 2021 года.

Аплаціць яго можна і да атрымання паведамлення праз сістэму АРІП.

Даплата транспартнага падатку за 2021 будзе праводзіцца не пазней за 15 лістапада наступнага года на падставе паведамлення падатковага органа, якое будзе накіравана плацельшчыкам не пазней за 1 верасня 2022 года.



### Стаўкі транспартнага падатку

Стаўкі, якія прыведзены ў дадатку да Падатковага кодэкса на гэты год, меншыя за тыя, што плацілі ўладальнікі машын раней. Цяпер сума падатку таксама залежыць ад дазволенай максімальнай масы, ёмістасці або прапісаная за адну адзінку транспартнага сродку. Прынцып, чым большая маса, тым больш плаціць, захаваўся, але стаўкі зрабілі меншымі.

Калі звестак аб дазволенай максімальнай масе няма, падатак разлічваецца ў памеры мінімальнай стаўкі для адпаведнага тыпу транспартнага сродку.

### Якія ёсць льготы і як іх можна атрымаць?

Вядома, ільготы ёсць. Напрыклад, 50 працэнтаў ад сумы падатку будуць плаціць ветэраны Вялікай Айчыннай вайны, інваліды 1-й і 2-й груп, а таксама пенсіянеры. На 25 працэнтаў менш будуць плаціць інваліды 3-й групы (за выключэннем выпадку, калі падатак ім плаціць не трэба зусім).

Праўда, ёсць адзін важны нюанс: зніжкі дадуць толькі пры наяўнасці ў ільготніка сапраўднага пасведчання кіроўцы адпаведнай катэгорыі. Гэта значыць, аформіць аўтамабіль на дзедапенсіянера, каб заплаціць у два разы менш, не атрымаецца.

Як і ў выпадку з іншымі маёмаснымі падаткамі, мясцовыя органы ўлады могуць вызваляць ад выплаты падатку (цалкам або часткова) тых, хто апынуўся ў цяжкай жыццёвай сітуацыі. Але транспартны сродак не павінен пры гэтым выкарыстоўвацца для ажыццяўлення прадпрымальніцкай дзейнасці.

З усімі падрабязнасцямі можна пазнаёміцца на сайце nalog.gov.by. Удачы на дарогах!

**Данііл ХМЯЛЬНІЦКІ.**

| Стаўка падатку на аўтамабіль | За год |
|---|---|
| **Для фізічных асоб** | |
| масай да 1,5 тоны | 61 рубель |
| большай за 1,5 тоны, але не большай за 1,75 тоны | 81 рубель |
| большай за 1,75 тоны, але не большай за 2 тоны | 102 рублі |
| большай за 2 тоны, але не большай за 2,25 тоны | 122 рублі |
| большай за 2,25 тоны, але не большай за 2,5 тоны | 142 рублі |
| большай за 2,5 тоны, але не большай за 3 тоны | 162 рублі |
| большай за 3 тоны | 223 рублі |
| матацыкл | 41 рубель |
| **У арганізацый** | |
| масай да 1 тоны | 162 рублі |
| большай за 1 тону, але не большай за 2 тоны | 209 рублёў |
| большай за 2 тоны, але не большай за 3 тоны | 255 рублёў |
| большай за 3 тоны | 325 рублёў |
| матацыкл | 70 рублёў |

Супрацоўніцтва

## На шляху да ўдасканалення

### Эксперты з СНД — аб актуальных рэаліях у сферы бяспекі і правапарадку

**У рамках міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі «30 гадоў Садружнасці Незалежных Дзяржаў: вынікі, перспектывы», якая гэтымі днямі праходзіць у Мінску, у Акадэміі Міністэрства ўнутраных спраў эксперты з розных краін абмеркавалі пытанні ўзаемадзеяння, звязаныя з бяспекай, барацьбой са злачыннасцю і тэрарызмам.**

Як адзначыў **кіраўнік Акадэміі МУС генерал-маёр міліцыі Аляксандр ВАСІЛЬЕЎ**, супрацоўніцтва дзяржаў у сферы бяспекі, барацьбы са злачыннасцю і тэрарызмам у цяперашні час з'яўляецца важным і актуальным пытаннем. «Правядзенне канферэнцыі паспрыяе ўмацаванню ўзаемадзеяння ў гэтым кірунку, ініцыяцыі новых сумесных даследаванняў, — перакананы начальнік Акадэміі МУС. — Упэўнены ў развіцці атмасферы ўзаемапаразумення, умацавання навуковых сувязяў».

З дакладамі па самых актуальных пытаннях выступілі супрацоўнікі праваахоўных і іншых дзяржаўных органаў, навуковых і адукацыйных устаноў дзяржаў — удзельніц Садружнасці, а таксама прадстаўнікі Выканаўчага камітэта і органаў галіновага супрацоўніцтва СНД у сферы бяспекі і правапарадку.

Дарэчы, гэтымі днямі ў Мінску абмяркоўваецца шырокі спектр пытанняў развіцця Садружнасці Незалежных Дзяржаў, выпрацоўваюцца канкрэтныя рэкамендацыі па павышэнні яго эфектыўнасці і вызначэння стратэгіі ўдасканалення. У мерапрыемствах канферэнцыі прымае ўдзел звыш 300 прадстаўнікоў дзяржаўных органаў, органаў СНД, вядучыя вучоныя і спецыялісты, кіраўнікі найбуйнейшых навуковых і навучальных арганізацый Азербайджана, Арменіі, Беларусі, Казахстана, Кыргызстана, Малдовы, Расіі, Таджыкістана, Узбекістана.

**Вераніка КАНЮТА.**

І так бывае

## ПРЫЗНАЧЫЎ СЯБЕ НАЧАЛЬНІКАМ

### І па фіктыўных дакументах афармляў растэрміноўкі на гаджэты

**Супрацоўнікамі крымінальнага вышуку Цэнтральнага РУУС сталіцы затрыманы 29-гадовы жыхар Стаўбцоўскага раёна, які ў салонах сотавай сувязі ашуканскім шляхам завалодаў дарагімі мабільнымі тэлефонамі. На сёння вядома пра чатыры факты махлярства, агульная сума нанесенай шкоды склала звыш 5000 рублёў.**

Па інфармацыі ГУУС Мінгарвыканкама, мужчына прыходзіў у салоны сотавай сувязі і прадстаўляўся кіраўніком сталічнай арганізацыі. У якасці доказу прад'яўляў выпіскі загадаў аб прызначэнні яго на пасаду, пасля чаго афармляў мабільныя тэлефоны ў растэрміноўку па спецыяльным дадатку для юрыдычных асоб. У сувязі з тым, што аплата па растэрміноўцы не паступала, адміністрацыя салонаў сувязі звязалася з названымі ў дакументах прадстаўнікамі юрыдычнай асобы. Высветлілася, што загады аб прызначэнні на пасаду фіктыўныя.

Супрацоўнікі крымінальнага вышуку ўстанавілі, што затрыманы самастойна вырабляў выпіскі з загадаў аб сваім прызначэнні кіраўніком, выкарыстоўваючы рэквізіты розных сталічных арганізацый і выдуманыя анкетныя даныя. Набытыя ў растэрміноўку тэлефоны рэалізоўваў, атрыманыя грашовыя сродкі траціў на асабістыя патрэбы.

Раней мужчына прыцягваўся да крымінальнай адказнасці за маёмасныя злачынствы.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Колькасць забойстваў у ЗША ўзрасла амаль на трэць



Колькасць учыненых у ЗША забойстваў значна ўзрасла ў мінулым годзе. Пра гэта паведамляюць амерыканскія медыярэсурсы са спасылкай на адпаведны даклад ФБР. Згодна з ім, колькасць забойстваў павялічылася прыкладна на 30 працэнтаў у 2020 годзе ў параўнанні з 2019-м. Летась у ЗША здзейснена больш за 21 тысячу забойстваў, годам раней — каля 16 тыс. Адзначаецца, што гэта самы рэзкі рост паказчыка за год за ўвесь час адсочвання ФБР даных па такіх злачынствах у краіне з 1960-х. У дакладзе адзначаецца, што летась значна павялічылася іх колькасць у летнія месяцы. Амаль 80 працэнтаў забойстваў здзейснена з выкарыстаннем агнястрэльнай зброі. Заходнія эксперты звязваюць гэты рост у тым ліку з наступствамі пандэміі COVID-19, у прыватнасці з абмежавальнымі мерамі, якія нярэдка ўводзяцца ўладамі.

### У Японіі вызначыўся наступны прэм'ер

Былы кіраўнік МЗС Японіі Фуміа Кісіда абраны новым старшынёй кіруючай у краіне Ліберальна-дэмакратычнай партыі, ён стане наступным прэм'ер-міністрам. Пра гэта паведаміла выданне The Nikkei. Новага старшыню ўдалося выбраць толькі ў другім туры, дзе Фуміа Кісіда набраў 257 з 427 галасоў. Яго апанент, колішні кіраўнік МЗС і Мінабароны Японіі Тара Кона, атрымаў 170 галасоў. Такім чынам, Кісіда цяпер займае пасаду старшыні Ліберальна-дэмакратычнай партыі і неўзабаве стане новым, 100-м прэм'ер-міністрам Японіі. Як адзначае японская газета The Asahi Shimbun, новы старшыня кіруючай партыі заявіў, што гатовы неадкладна прыступіць да сваіх абавязкаў. Адной з прыярытэтных задач Фуміа Кісіда назваў выпрацоўку эканамічных мер па барацьбе з наступствамі каранавіруса ў Японіі.



### Актыўных карыстальнікаў TikTok — больш за мільярд



Колькасць штомесячных актыўных карыстальнікаў сэрвісу абмену кароткімі відэа TikTok перавысіла мільярд, адзначаецца ў паведамленні платформы. «Дадатак TikTok стаў любімай часткай жыцця людзей па ўсім свеце дзякуючы крэатыўнасці і арыгінальнасці нашых аўтараў», — адзначаюць у TikTok. Кампанія, якая належыць кітайскай ByteDance Ltd., паведаміла, што плануе ўкараніць функцыю больш доўгіх відэа, каб дапамагчы сваім карыстальнікам зарабляць больш. Пры гэтым стала вядома, што TikTok ужо апярэдзіў YouTube па сярэднім часе прагляду. Гэта вынікае са справаздачы, якая была падрыхтавана кансалтынгавай кампаніяй App Annie.

# АД «НЁМАНСКАЙ ВЯСНЫ» ДА ВЕРАСНЁЎСКАГА МАРАФОНУ

## Водны сезон на Аўгустоўскім канале завяршыўся міжнароднымі стартамі

**Яны праходзяць у Гродне штогод і сталі традыцыйнымі. Сёлета Міжнародны водны марафон «Аўгустоўскі канал — 2021» сабраў 55 удзельнікаў з Беларусі, Расіі, Узбекістана і Ізраіля. Спаборніцтвы прайшлі ў апошні ўік-энд верасня і, па сутнасці, паставілі кропку ў чарговым турыстычным летнім сезоне.**




Так склалася, што фестываль «Нёманская вясна», які праходзіць у першыя выхадныя красавіка, адкрывае сезон воднага турызму, а 27 верасня, у дзень турызму, марафон «Аўгустоўскі канал» яго завяршае. Арганізатарамі спаборніцтва выступілі Міністэрства спорту і турызму Беларусі, Рэспубліканскі турысцка-спартыўны саюз, Міжнародная федэрацыя спартыўнага турызму, Рэспубліканскі вучэбна-метадычны цэнтр фізічнага выхавання насельніцтва.

Як звычайна, удзельнікі марафону стартавалі з тэрыторыі пляжнай зоны Нёмана каля Старога мосту. Пасля размеркавання і нумарацыі 30 экіпажаў спартсменаў-аматараў накіраваліся на байдарках у бок Аўгустоўскага канала. Менавіта там, на шлюзе Нямнова, адбыўся фініш першай воднай дыстанцыі. Другі ўчастак спаборніцтваў прайшоў па дзікіх мясцінах Гродзенскай пушчы, дзе працякаюць рэчкі Марыха, Шляміца і Чорная Ганча. Каб адолець дыстанцыю, турыстам спатрэбілася ад пяці да дзевяці гадзін. Праўда, не ўсе паспяхова дайшлі да фінішу. Для некаторых байдарачнікаў маршрут аказаўся занадта складаны. Затое ўсе атрымалі добрую порцыю адрэналіну і масу прыемных уражанняў.

— Мы склалі дыстанцыю такім чынам, каб усе ўдзельнікі не толькі паказалі сваё майстэрства, але і атрымалі захапленне ад воднай трасы. Напрыклад, убачылі з боку Нёмана віды старажытнага Гродна са Старым замкам і Каложай на схіле. Многія былі тут упершыню і, вядома, не мелі ўяўлення, як выглядае Аўгустоўскі канал, у прыватнасці шлюз Нямнова, дзе якраз адбыўся фініш першай дыстанцыі, — расказаў **галоўны суддзя марафону, віцэ-прэзідэнт Міжнароднай федэрацыі спартыўнага турызму Сяргей КАЛЯДА.**

Другі ўчастак быў больш экстрэмальны. Рачулкі ў некаторых месцах пераўтвараліся ў вузкую цясніну, а схілы даходзілі да 30 метраў. Адсутнасць населеных пунктаў рабіла гэтыя мясціны па-сапраўднаму дзікімі. Байдарачнікі неаднойчы назіралі, як да ракі падыходзілі ласі, казулі, мільгалі зайцы і лісіцы. Яны без асаблівага страху ішлі ўздоўж рэчкі, дзе плылі рознакаляровыя экіпажы. Дарэчы, экстрэмальная траса выклікала ў турыстаў-воднікаў адпаведны настрой. Магчыма, ад адрэналіну...

— Турысты-воднікі, у прыватнасці марафонцы, — гэта асаблівыя людзі, іх многім цяжка зразумець, бо турызм у нейкім сэнсе — гэта хвароба, спорт плюс уражанні, — канстатуе Сяргей Каляда.

Беларусь прадставіла пяць каманд: з Мінскай, Гродзенскай і Брэсцкай абласцей, сталіцы і каманду клуба «Каяк» з Барысава. Свая каманда была і ў Расійскай Федэрацыі. Некалькі турыстаў прыехалі з Узбекістана і Ізраіля. Асабліва парадавала надвор'е. Аказалася, што такі асенні ўік-энд — самы спрыяльны для марафону. Ці то ў гэтым прычыны, ці то ў майстэрстве ўдзельнікаў, але ўсе прайшлі свае трасы без эксцэсаў. Хоць медыцынская дапамога была напагатове: разам з турыстамі-воднікамі на байдарцы плыў доктар з усімі неабходнымі медыкаментамі. Вынікі былі падведзены пасля двух дзён спаборніцтва. Падлік просты: у каго аказаўся лепшы пакаючык па хуткасці, той і пераможа. Гэтым разам у тройку лідараў увайшлі каманды Мінскай вобласці, горада Мінска і каманда «Каяк» з Барысава. Кожны ўдзельнік атрымаў памятны медаль, гэта таксама прыкмета часу — прывецці штосьці адметнае з мерапрыемства. Медалі якраз і сталі такімі сувенірамі, якіх не набудзеш у краме, яны спецыяльна выраблены для дадзеных спаборніцтваў.




— Водны турызм асабліва быў папулярны ў Беларусі ў 70—90-я гады XX стагоддзя. Тады толькі ў Гродне налічвалася каля дзесятка моцных каманд, якія ствараліся на базе буйных прадпрыемстваў. Цяпер у горадзе такая каманда засталася толькі на заводзе «Гродна Азот». Тым не менш усё больш маладых людзей цікавяцца водным турызмам, з'явілася нават пэўная канкурэнцыя за месца ў камандзе, — заўважае Сяргей Каляда.

Удзельнікі марафону атрымалі масу ўражанняў. Для іх быў арганізаваны велатур па новых маршрутах Аўгустоўскага канала. Водныя турысты з задавальненнем праехалі па маляўнічых кутках старажытнага воднага шляху, даведаліся аб цікавых фактах будаўніцтва гісторыка-культурнага аб'екта XIX стагоддзя.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**
**Фота дадзена арганізатарамі марафону.**

# КРЫНІЦА ЎРАЖАННЯЎ...

## Абуджэнне цікавасці

**Дырэктар Дэпартамента па турызме Міністэрства спорту і турызму Рэспублікі Беларусь Ірына ВАРАНОВІЧ** падчас прэс-канферэнцыі, прысвечанай Сусветнаму дню турызму, заўважыла, што сапраўды галіна моцна змянілася, прайшла пераарыентацыя на ўнутраны рынак, і многія аператары, якія раней працавалі на выезд, сёння арыентаваны на развіццё ўласнага пазнавальнага экскурсійнага патэнцыялу.

Пандэмія стала матыватарам для абуджэння цікавасці да ўласнай гісторыі і культуры. Прычым людзі пачалі заязджаць у раней не раскручаныя куточкі Беларусі. Наогул, неалакалізм — сусветная тэндэнцыя ў турызме, калі вандроўнікі хочуць глядзець і спажываць прадукты і традыцыі, характэрныя для пэўнай мясцовасці. Так, у Моталь едуць на тутэйшы каравай, беларускі абрад «Калядныя цары», які першым трапіў у спіс нематэрыяльнай спадчыны ЮНЕСКА, важна паглядзець менавіта ў вёсцы Семежава, дзе ён зарадзіўся, а банкуху хочацца адведаць у вёсцы, дзе рэцэпт яе прыгатавання перадаваўся ад пакалення да пакалення.

Сёння ствараюцца і раскручваюцца новыя маршруты, новыя аб'екты для паказу, узводзяцца мемарыяльныя комплексы, звязаныя з гісторыяй Вялікай Айчыннай вайны, развіваецца музейная справа. Перад прадстаўнікамі галіны яшчэ шмат разнастайных задач. Напрыклад, распрацоўка маршрутаў для людзей, якія маюць пэўныя фізічныя абмежаванні. Уласна, менавіта інклюзія абрана тэмай сёлетняга Сусветнага дня турызму.

## Што схавана ў рэгіёнах?

Са студзеня атэставана каля паўтары сотні гідаў-перакладчыкаў і экскурсаводаў. Многія з іх стараюцца прапанаваць цікавыя тэмы, увесці свой матэрыял, накласці яго на тыя турыстычныя дыстынацыі, якія дазваляюць адкрыць новыя бакі беларускай культуры, гісторыі, па-іншаму зірнуць на прыродную спадчыну. І калі раней атэстацыя праходзіла ў сталіцы, то ў апошнія гады яна бывае і выязная, прычым тэматычна падстройваецца пад канкрэтныя групы.

Усё большую папулярнасць набываюць аўтарскія маршруты, экскурсаводы ведаюць, як зацікавіць турыстаў мясцовай самабытнай культурай і тым цікавым інфармацыйным, пазнавальным патэнцыялам, што схаваны ў рэгіёнах.

Як паведаміў **дырэктар Нацыянальнага агенцтва па турызме Павел САПОЦЬКА**, сёння спецыялісты галіны працуюць над тэмай, прысвечанай месцам памяці, звязаным з Айчыннай вайной 1812 года, Першай і Другой сусветнымі войнамі. Такія аб'екты маюць сур'ёзнае асветніцкае значэнне і іх неабходна ўводзіць у турызм. Яшчэ адно даследаванне звязанае з палацава-паркавымі ансамблямі і сядзіба-паркавымі комплексамі. На вялікі жаль, не ўсе беларусы ведаюць пра тое, што ў нас кожны рэгіён насычаны вялікай колькасцю матэрыяльных аб'ектаў гісторыка-культурнай спадчыны, і, безумоўна, важна ўводзіць гэты патэнцыял у турыстычную дзейнасць. Не засталася па-за ўвагай і нематэрыяльная гісторыка-культурная спадчына: беларуская кухня, фальклор, традыцыйныя абрады, промыслы і рамёствы, этнаграфічныя аб'екты. Усё гэта вельмі каштоўны матэрыял, здольны ўзбагаціць любую турыстычную праграму.

## Вясковыя сюрпрызы

Сёння ў аграсядзібах часта можна пачуць здзіўленыя воклічы турыстаў: «Няўжо ў нас такое бывае?» Сапраўды, нашы вёскі багатыя на сюрпрызы. Агратурызм развіваецца дзякуючы крэатыўным ініцыятывам. У краіне створана каля трох тысяч аграсядзіб, канкурэнцыя расце, і, каб завабіць да сябе гасцей, гаспадары імкнуцца аздобіць свае турпрапановы за кошт уласных ідэй, ведаў і ўменняў. За звычайнымі домікамі на вёсцы могуць стаяць насычаныя праграмы, музеі, майстар-класы, фестывалі і адкрыцці.

Сельскі турызм пачаў маладзець. На вёску са сваімі ідэямі пацягнулася моладзь, сем'і з малымі дзецьмі. Так, у Валожынскім раёне сёлета маладая шматдзетная сям'я адкрыла новую сядзібу, у якой праводзяцца майстар-класы па піве. Група турыстаў прыязджае сюды, «закладае» сваё піва, а праз тры тыдні вяртаецца па гатовы прадукт. Трэба адзначыць, што гаспадары — прадстаўнікі новага пакалення, яны паспелі папрацаваць у IT, сацсетках, сістэме продажаў і ведаюць, як сябе падаць, — месцы тут раскупляюцца на некалькі месяцаў наперад.

Керамісты, мастакі, скульптары робяць на сваіх сядзібах арт-рэзідэнцыі (напрыклад, можна згадаць сядзібы «Стулы», «Птах»). Гаспадары аграсядзібы «Альхова» па мясцовых рэцэптах пякуць хлеб і праводзяць майстар-класы, а яшчэ яны зладзілі экспедыцыю па Ваўкавыскім раёне і нават зрабілі буклет, прысвечаны традыцыйным стравам.

Гаспадары розных сядзіб пачалі аб'ядноўвацца, дамаўляцца з мясцовымі жыхарамі, рамеснікамі, установамі адукацыі і культуры і ствараць насычаныя праграмы для турыстаў пад адзіным брэндам. Так, у гэтым годзе запрацуе новы кластар «Наваколле» ў Брэсцкай вобласці. Яго прэзентацыя пройдзе 23—24 кастрычніка. Ён аб'ядноўвае гаспадароў сядзіб, рамеснікаў і асоб, якія ведаюць, чым смачным пачаставаць турыстаў. Кластар створаны на базе Кобрынскага і суседніх раёнаў. Падчас прэзентацыі можна будзе пазнаёміцца з музеем вясковага скульптара, які з дрэва паспеў выразаць цэлую гісторыю сваёй вёскі, даведацца пра пэт-тэрапію (гэта «фішка» сядзібы «Зялёна хата», якая мае ўласны заапарк). Сюды з'едуцца рамеснікі і фермеры.

Дзякуючы падобнаму ўзаемадзеянню аграсядзібы гатовы прымаць ужо не толькі невялікія групы турыстаў, але і экскурсійныя аўтобусы. І тураператары пачалі дадаваць у свае маршруты вясковыя пункцікі. Як вынік — агратурызм пачаў ажыўляць вёскі. Там, дзе дзякуючы ініцыятывам гаспадароў аграсядзіб закіпела жыццё, сталі выкупляцца закінутыя домікі, у мясцовых жыхароў з'явілася магчымасць прадаць сваю прадукцыю, абуджаецца цікавасць да творчасці.

## Спіс пазашкольных вандровак

Новыя маршруты, музейныя праграмы, праекты, фестывалі — выдатны рэсурс для дадатковай адукацыі і выхавання дзяцей і моладзі. Насамрэч ужо можна даваць школьнікам на лета (ці канікулы і выхадныя) не толькі спіс пазашкольнай літаратуры, але і спіс карысных вандровак. Падказкі, куды паехаць, можна знайсці на сайце Нацыянальнага агенцтва па турызме і Рэспубліканскага цэнтра турызму і краязнаўства.

Калі раней у школах не было прынята ўключаць турыстычныя вандроўкі ў працэс навучання, то сёння тэма адукацыйнага турызму актыўна абмяркоўваецца на высокім узроўні. «На працягу года мы шчыльна працавалі з Міністэрствам адукацыі, і было прынята рашэнне, што ў межах школьных дысцыплін — геаграфіі, гісторыі, літаратуры — школьнікі будуць наведваць пэўныя аб'екты. Дзеці павінны ведаць гісторыю, а вандроўкі паспрыяюць патрыятычнаму выхаванню», — заўважыла Ірына Варановіч. Прапрацоўваюцца пытанні, як зрабіць такія паездкі для школьнікаў больш даступнымі. Таксама варта прадумаць пытанні з арганізацыяй экскурсій для класаў.

**Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

ПРАВИЛА ПРОВЕДЕНИЯ РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ

# ИГРАЙ ПО-МАСТЕРСКИ С БЕЛГАЗПРОМБАНКОМ



ВЫИГРАЙ 20 000 рублей!

Белгазпромбанк. Энергия твоего будущего!

mastercard

Настоящие правила проведения рекламной игры «Играй по-мастерски с Белгазпромбанком!» (далее – Правила), разработаны в соответствии с Положением о проведении рекламных игр на территории Республики Беларусь, утвержденным Указом Президента Республики Беларусь от 30.01.2003 № 51 (с изменениями и дополнениями), и определяют порядок проведения рекламной игры «Играй по-мастерски с Белгазпромбанком!» (далее – Рекламная игра).

**1. Сведения об организаторе**

Организатором Рекламной игры является Частное предприятие «Айсберри», УНП 191117734, зарегистрировано 02 июня 2009 г. решением Минского городского исполнительного комитета в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 191117734 (далее – Организатор).

Юридический адрес: 220014, г. Минск, пер. С. Ковалевской, 54/1, каб. 303-79.

1.1. Заинтересованное лицо – ОАО «Белгазпромбанк».

**2. Наименование Рекламной игры:** «Играй по-мастерски с Белгазпромбанком!».

**3. Территория проведения Рекламной игры:** Республика Беларусь.

**4. Период проведения Рекламной игры:** с 01.10.2021 г. по 31.01.2022 г. включая период розыгрыша и вручения призов.

**5. Комиссия по проведению Рекламной игры:**

Для контроля за ходом Рекламной игры создается комиссия по ее проведению. Комиссия осуществляет свою деятельность в период проведения Рекламной игры. Комиссия состоит из Председателя и 4 членов.

Председатель комиссии: Максимчук Юлия Владимировна, начальник отдела маркетинга ОАО «Белгазпромбанк».

Члены комиссии:

1. Коряков Александр Витальевич, видеоинженер-дизайнер ЧП «Айсберри»;
2. Врублевская Ольга Александровна, главный бухгалтер ЧП «Айсберри»;
3. Канаш Павел Витальевич, главный специалист управления информационной политики ОАО «Белгазпромбанк»;
4. Варикаш Руслан Александрович, главный специалист отдела рекламных коммуникаций ОАО «Белгазпромбанк».

Комиссия осуществляет контроль за соблюдением настоящих Правил проведения Рекламной игры, рассматривает возникшие жалобы и предложения со стороны Участников. Члены комиссии обязаны осуществлять возложенные на них полномочия в течение периода проведения Рекламной игры.

**6. Наименование услуг, в целях стимулирования реализации которых проводится Рекламная игра:** стимулирование безналичных расчётов физическими лицами с использованием банковских платежных карточек международной платежной системы **«MASTERCARD»,** эмитированных ОАО «Белгазпромбанк».

При использовании в Правилах термин **«карточка»** используется в значении, определенной статьей 273 Банковского кодекса Республики Беларусь: «Банковская платежная карточка – платежный инструмент, обеспечивающий доступ к банковскому счету, счетам по учету вкладов (депозитов), кредитов физического или юридического лица для получения наличных денежных средств и осуществления расчетов в безналичной форме, а также обеспечивающий проведение иных операций в соответствии с законодательством Республики Беларусь».

**7. Состав и размер призового фонда Рекламной игры и источники его формирования:** призовой фонд Рекламной игры составляет сумму в размере **190 229,90 (Сто девяносто тысяч двести двадцать девять) белорусских рублей 90 копеек,** формируется за счет денежных средств Заинтересованного лица и состоит из:

**Таблица № 1. Призовой фонд Рекламной игры:**

| № п/п | Наименование призов, участвующих в розыгрыше | Стоимость приза, бел. руб. | Количество призов, шт. | Общая сумма, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| 1. | **СУПЕРПРИЗ** | **20 000,00** | 1 | 20 000,00 |
| | денежные средства | 2 988,51 | | 2 988,51 |
| | (далее по тексту – СУПЕРПРИЗ) | | | |
| 2. | **главный ежемесячный приз** | **5 000,00** | 3 | 15 000,00 |
| | денежные средства | 747,13 | | 2 241,39 |
| | (далее по тексту – главный ежемесячный приз) | | | |
| 3. | **денежный приз** | **100,00** | **1 500** | 150 000,00 |
| | | | **ИТОГО:** | **190 229,90** |

**8. Условия, при соблюдении которых физическое лицо становится Участником Рекламной игры:**

8.1. Участниками Рекламной игры могут быть физические лица – держатели платежной карточки международной платежной системы **«MASTERCARD»,** эмитированной ОАО «Белгазпромбанк», достигшие 18 лет: граждане Республики Беларусь, а также иностранные граждане и лица без гражданства, имеющие вид на жительство в Республике Беларусь и постоянно проживающие на территории Республики Беларусь, лица без гражданства, которым предоставлен статус беженца в Республике Беларусь;

8.2. Участником Рекламной игры не может быть лицо, состоящее в трудовых отношениях с Организатором, супруг (супруга) такого лица, его близкие родственники, а также лица, находящиеся с таким лицом в отношениях свойства, а также Члены комиссии по проведению Рекламной игры.

**9. Для участия в Рекламной игре необходимо в период с 01 октября 2021 г. по 31 декабря 2021 г. включительно:**

9.1. Быть или стать держателем платежной карточки международной платежной системы **«MASTERCARD»,** эмитированной ОАО «Белгазпромбанк» (далее – Карточка).

9.2. Для участия в **ежемесячных** розыгрышах совершить с использованием одной Карточки, **не менее 4 (Четырех)** безналичных операций в периоды, указанные в Таблице № 2, по оплате товаров (работ, услуг) в объектах торговли и сервиса, при этом сумма каждой безналичной операции должна быть **не менее 30,00 (Тридцати)** белорусских рублей;

9.3. Для участия в розыгрыше **СУПЕРПРИЗА** совершить **не менее 15 (Пятнадцати)** безналичных операций в период с 01 октября по 31 декабря 2021 г., по оплате товаров (работ, услуг) в объектах торговли и сервиса, при этом сумма каждой безналичной операции должна быть **не менее 30,00 (Тридцати)** белорусских рублей;

9.4. зарегистрировать участвующую Карточку (а если у Участника несколько Карточек, то каждую участвующую Карточку) на интернет-сайте: **www.belgazprombank.by** (далее – Сайт), указав:

1. фамилию (обязательно), имя (обязательно), отчество (обязательно при наличии) держателя Карточки на русском языке, формат заполнения – как в документе, удостоверяющем личность, пример – Иванов Иван Иванович (обязательное для заполнения поле);
2. личный номер мобильного телефона держателя Карточки (обязательно) в формате – код мобильного оператора, номер абонента (пример – +375297896367, где 29 – код мобильного оператора, а 7896367 – номер абонента, без пробелов и символов);
3. первые четыре цифры и последние четыре цифры номера участвующей Карточки, с помощью которой была совершена безналичная операция. В случае, если в Рекламной игре участвует несколько Карточек одного Участника, то зарегистрировать каждую Карточку. В случае совершения Участником Рекламной игры безналичной операции с использованием электронной копии платежной Карточки «MASTERCARD» (посредством мобильных платежных сервисов «Apple Pay», «Samsung Pay», «Mi Pay», «Кошелёк»), регистрировать необходимо первые четыре цифры и последние четыре цифры номера **физической Карточки** «Mastercard» или первые четыре цифры и последние четыре цифры номер Карточки, эмитированной в рамках варианта продукта «Виртуальная карточка», и отраженных в формах услуг дистанционного банковского обслуживания «Интернет-банк» и «Мобильное приложение» BGPB mobile ОАО «Белгазпромбанк»;

Также Участнику необходимо подтвердить согласие на участие в Рекламной игре, ознакомление с настоящими Правилами, а также подтвердить согласие на предоставление Заинтересованным лицом Организатору своих персональных данных для проведения Рекламной игры на Сайте, путем проставления соответствующей галочки при заполнении регистрационной формы.

При условии совершения Участником Рекламной игры, с использованием зарегистрированной Карточки, **не менее 4 (четырех)** безналичных операций в периоды, указанные в Таблице № 2, каждая безналичная операция на сумму от **30,00 (Тридцати)** белорусских рублей будет участвовать в розыгрыше **главного ежемесячного приза** в размере 5 000,00 белорусских рублей **или денежного приза** (500 призов) в размере 100,00 белорусских рублей каждый.

При условии совершения Участником Рекламной игры **не менее 15 (Пятнадцати)** безналичных операций в период с 01 октября по 31 декабря 2021 г., каждая безналичная операция на сумму от **30,00 (Тридцати)** белорусских рублей будет участвовать в розыгрыше **СУПЕРПРИЗА** в размере 20 000,00 белорусских рублей.

Каждый Участник Рекламной игры за период с 01 октября по 31 декабря 2021 г., **может выиграть не более ЧЕТЫРЕХ (3 ежемесячных приза и СУПЕРПРИЗ)** денежных призов, по одному призу в каждом розыгрыше.

Ежемесячные призы будут разыгрываться в каждом месяце, следующим за месяцем, в котором совершались безналичные операции по зарегистрированной Карточке (например, в розыгрыше, который пройдет в ноябре 2021 года будут участвовать операции, совершенные в октябре 2021 года, в розыгрыше, который пройдет в декабре 2021 года будут участвовать операции, совершенные в ноябре 2021 года и т.д.).

**10. Не допускаются к участию в Рекламной игре безналичные операции, которые:**

- совершены с использованием Карточки «MASTERCARD» **до** 00 часов 00 минут 01.10.2021 года или **после** 23 часов 59 минут 59 секунд 31.12.2021 года;
- совершены операции по снятию наличных денежных средств или пополнению счета;
- совершены в устройствах самообслуживания: банкоматы, инфокиоски, платёжные терминалы самообслуживания;
- связаны с оплатой телекоммуникационных услуг;
- совершены операции, проведенные в кассах отделений и каналах дистанционного банковского обслуживания банков или в РУП «Белпочта»;
- совершены посредством форм услуг дистанционного банковского обслуживания «Интернет-банк», мобильное приложение BGPB Mobile, SMS-управление ОАО «Белгазпромбанка», платёжного ресурса https://p2p.bgpb.by/p2p/ и https://pay.bgpb.by/, сервиса переводов на сайте http://belgazprombank.by;
- совершены операции перевода денежных средств с/на другую платежную карточку;
- совершены операции с использованием платежной карточки «MASTERCARD», не зарегистрированной на сайте;
- операции, по которым денежные средства, перечисленные в рамках безналичной операции по совершенной в период **с 01 октября 2021 г. по 31 декабря 2021 г.,** были частично или в полном объеме возвращены объектами торговли и сервиса Участнику Рекламной игры.

Организатор оставляет за собой право проверки данных о достоверности совершённых безналичных операций Участниками Рекламной игры, в том числе обратиться к заинтересованному лицу в целях проверки безналичных операций, участвующих в Рекламной игре.

**11. Порядок розыгрыша, уведомления Победителей о результатах розыгрыша и вручения призов.**

11.1. Розыгрыши призов проходят по адресу: Республика Беларусь, РУП «Отель «Минск», г. Минск, пр. Независимости, 11/2, конференц-зал отеля «Минск», в соответствии с датами и временем, указанным в Таблице № 2.

11.2. Розыгрыш призового фонда проводится открыто с возможностью присутствия на нем Участников Рекламной игры. Результаты розыгрыша Рекламной игры не должны зависеть от воли Организатора и не могут быть никем специально устроены.

11.3. Розыгрыши призов проводятся согласно следующему графику:

**Таблица № 2. Розыгрыши призов:**

| № № | Дата и время розыгрыша | Период регистрации Участника на сайте | Период совершения безналичных операций | Приз |
|---|---|---|---|---|
| 1 | **17.11.2021 11:00** | с 00:00:00 **01.10.2021** по 23:59:59 **31.10.2021** | с 00:00:00 **01.10.2021** по 23:59:59 **31.10.2021** | главный ежемесячный приз – 1 шт. и ежемесячный приз – 500 шт. |
| 2 | **16.12.2021 11:00** | с 00:00:00 **01.10.2021** по 23:59:59 **30.11.2021** | с 00:00:00 **01.11.2021** по 23:59:59 **30.11.2021** | главный ежемесячный приз – 1 шт. и ежемесячный приз – 500 шт. |
| 3 | **19.01.2022 11:00** | с 00:00:00 **01.10.2021** по 23:59:59 **31.12.2021** | с 00:00:00 **01.12.2021** по 23:59:59 **31.12.2021** | главный ежемесячный приз – 1 шт. и ежемесячный приз – 500 шт. |
| 4 | **19.01.2022 11:15** | с 00:00:00 **01.10.2021** по 23:59:59 **31.12.2021** | с 00:00:00 **01.10.2021** по 23:59:59 **31.12.2021** | **СУПЕРПРИЗ – 1 шт.** |

11.4. Для розыгрыша по фамилии, имени и отчеству (при наличии) Участника Рекламной игры в алфавитном порядке формируется список Участников Рекламной игры, с указанием фамилии, имени, отчества (при наличии) Участника, первых четырех цифр и последних четырех цифр номера платежной Карточки и суммы операции.

Все номера имеют одинаковую разрядность. Каждому Участнику Рекламной игры присваивается игровой номер с первого разряда (0000001, 0000002, 0000003, 0000004 и т.д.) и данный номер является основанием для участия в розыгрыше приза.

Участнику Рекламной игры присваивается такое количество игровых номеров, которое соответствует количеству совершенных им операций, удовлетворяющих условиям Рекламной игры.

11.5. Определение выигрышных игровых номеров происходит следующим образом:

Для проведения розыгрыша используется лототрон и набор шаров в количестве 10-ти штук с номерами от 0 до 9. Определение выигрышных игровых номеров происходит путем их формирования слева направо из номеров шаров, поочередно извлекаемых из лототрона. Розыгрыш начинается с первого разряда слева.

В лототрон Организатором загружаются шары с номером от 0 по цифру, соответствующую первому разряду последнего зарегистрированного игрового номера. Шары перемешиваются, и из лототрона извлекается шар, номер которого определяет цифру первого разряда выигрышного игрового номера. Номер шара вносится в протокол.

Далее в лототрон загружаются те номера шаров, которые существуют по сверенному списку Игровых номеров в соответствующем разряде. Шары перемешиваются, и из секции лототрона извлекается шар, номер которого определяет цифру соответствующего разряда выигрышного игрового номера. Номер шара вносится в протокол.

Для определения последующих разрядов 3, 4, 5, 6, 7 выполняются те же действия. Номера шаров вносятся в протокол.

**Ежемесячный розыгрыш:**

Первым определяется Победитель главного ежемесячного приза в **5 000,00 (Пять тысяч)** белорусских рублей. Выигравшим главный ежемесячный приз считается **первый игровой номер,** определенный согласно п.11.5, а каждый **200-й (двухсотый), следующий за ним в списке,** в количестве 500 игровых номеров, получает денежный приз **в 100 (Сто)** белорусских рублей. Всего 1 (один) главный ежемесячный приз и 500 (пятьсот) денежных призов.

Каждый Участник Рекламной игры может выиграть не более одного ежемесячного денежного приза в каждом розыгрыше. В случае повторного попадания на уже Победившего Участника Рекламной игры, выигрышным считается следующий по списку Игровой номер иного Участника Рекламной игры. В случае если выигрышный игровой номер попадает на конец списка, то дальнейшее исчисление продолжается с начала списка.

В случае выигрыша ежемесячного приза Участник Рекламной игры продолжает участвовать в розыгрыше следующих ежемесячных призов и СУПЕРПРИЗА при выполнении всех условий Рекламной игры.

**Розыгрыш СУПЕРПРИЗА:**

Участвуют все Участники, совершившие **не менее 15 (Пятнадцати)** безналичных операций в период с 01 октября 2021 г. по 31 декабря 2021 г., каждая безналичная операция на сумму от **30,00 (Тридцати)** белорусских рублей. Розыгрыш проводиться согласно п.11.5.

11.6. Организатор уведомляет победителей о выигрыше СМС-сообщением и победителя СУПЕРПРИЗА письменно заказным письмом с уведомлением до 25 января 2022 г.

Для получения главного ежемесячного приза и СУПЕРПРИЗА победителю необходимо предоставить не позднее 29 января 2022 г. копию страниц паспорта 25, 31–33, или копию страниц 3, 15–17 вида на жительство, или двухстороннюю копию биометрического вида на жительство, или двухстороннюю копию ID-карты) любым из указанных способов:

- письмом по адресу: 220014, г. Минск, пер. С. Ковалевской, 54/1, каб. 303-79;
- письмом на электронный адрес: info@iceberri.by.

Все призы (за вычетом удержанной суммы подоходного налога из денежной части приза) до 31 января 2022 г. (включительно) будут перечислены каждому Победителю на его текущий (расчетный) счет в ОАО «Белгазпромбанк», доступ к которому обеспечивается банковской платежной Карточкой международной платежной системы «MASTERCARD», эмитированных ОАО «Белгазпромбанк» участвующей в Рекламной игре. В случае отсутствия у Победителя текущего (расчетного) счета в ОАО «Белгазпромбанк», доступ к которому обеспечивается Карточкой «MASTERCARD», сумма приза будет перечислена на любой активный текущий (расчетный) счет Победителя, открытый в ОАО «Белгазпромбанк» в белорусских рублях, доступ к которому обеспечивается банковской платежной Карточкой, эмитированной ОАО «Белгазпромбанк». Победитель должен проинформировать Организатора об отсутствии активного текущего (расчетного) счета, доступ к которому обеспечивается Карточкой «MASTERCARD» не позднее 29 января 2022 г., отправив сообщение на электронный адрес: info@iceberri.by или на телефон Организатора +375 (29) 183-79-34.

11.7. Призы не подлежат замене.

11.8. При получении призов Победители несут все права и обязанности по уплате подоходного налога в бюджет Республики Беларусь. Начисление, удержание и перечисление подоходного налога проводится в порядке, установленном Особенной частью Налогового кодекса Республики Беларусь и осуществляются Организатором.

11.9. Ответственность Организатора по выдаче призов ограничена исключительно вышеуказанным количеством и видами этих призов.

**12. Наименование печатного издания средства массовой информации для публикации Правил и результатов розыгрыша, сроки публикации.**

12.1. Правила Рекламной игры подлежат публикации в газете «Звязда» до начала Рекламной игры.

12.2. Результаты розыгрышей Рекламной игры подлежат публикации в газете «Звязда» не позднее 29 января 2022 г.

**13. Права и обязанности Участников Рекламной игры.**

13.1. Принимая участие в Рекламной игре, Участники Рекламной игры подтверждают свое ознакомление и согласие со всеми условиями настоящих Правил, а также принимают на себя обязательство выполнять все требования настоящих Правил и законодательства Республики Беларусь, вытекающие из участия в Рекламной игре и/или связанные с получением призов.

13.2. Факт участия в Рекламной игре подразумевает, что ее Участники соглашаются с тем, что в рамках данной Рекламной игры их имена, фамилии, отчества, фотографии, аудио и видео интервью и иные материалы о них могут быть использованы Организатором в рекламных целях связанных с проведением и результатами данной Рекламной игры, в том числе по радио, телевидению, в глобальной компьютерной сети Интернет и в иных средствах массовой информации, а также сниматься для изготовления графических рекламных материалов без уплаты им какого-либо вознаграждения в рамках данной Рекламной игры. Все права, в том числе исключительные имущественные права, на такие интервью и результаты съемки будут принадлежать Организатору.

13.3. Участники Рекламной игры при заполнении регистрационной формы на Сайте обязаны вводить достоверную информацию. Организатор не несет ответственность за достоверность данных, внесенных Участниками Рекламной игры в регистрационную форму, а также за последствия внесения Участником Рекламной игры недостоверной информации в регистрационную форму.

**14. Порядок предоставления информации по вопросам проведения Рекламной игры.**

14.1. Все возможные вопросы и претензии Участников Рекламной игры в отношении организации и условий передачи Призов должны быть адресованы Организатору Рекламной игры по адресу: 220014, г. Минск, пер. С. Ковалевской, 54/1, каб. 303-79, тел.: +375 (29) 183-79-34.

14.2. Информацию об условиях участия и проведения Рекламной игры можно получить по телефону 120, а также на сайте: **www.belgazprombank.by**.

14.3. Организатор не вступает в споры между Участниками Рекламной игры относительно определения собственника выигранного приза и/или претендентов на получение приза.

**15. Иные условия.**

15.1. Споры между Организатором и Участниками Рекламной игры рассматриваются согласно законодательству Республики Беларусь.

**Свидетельство о государственной регистрации Рекламной игры № 4077 от 27.09.2021 г., выдано Министерством антимонопольного регулирования и торговли Республики Беларусь.**

Слова дэпутату

# ПРАВЫ, АБАВЯЗКІ І ПРЫНЦЫП ІНКЛЮЗІІ

## Якія новаўвядзенні і падыходы прадугледжаны ў аднаўленым Кодэксе аб адукацыі

**На найбліжэйшы час новая рэдакцыя кодэкса рыхтуецца да другога чытання на восеньскай сесіі парламента. Калі будзе прыняты канчатковы варыянт, гаварыць рана. Між тым новая рэдакцыя ў многім адрозніваецца ад папярэдняй. Сістэма адукацыі патрабуе новых падыходаў.**

**Дэпутат Палаты прадстаўнікоў, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па адукацыі, культуры і навуцы Лілія КІР'ЯК** у інтэрв'ю «Звяздзе» акрэсліла самыя важныя моманты новага кодэкса.



### Як рыхтуецца дакумент

Кодэкс рыхтаваўся не знянацку. Міністэрства адукацыі некалькі гадоў збірала інфармацыю, прапановы і заўвагі. Работа была распачатая яшчэ дэпутатамі папярэдняга, 6-га склікання. У чэрвені гэтага года тэме адукацыі былі прысвечаны парламенцкія слуханні, дзе выступалі прадстаўнікі розных рэгіёнаў, розных узроўняў сістэмы адукацыі.

— Мы правялі значную папярэднюю работу — арганізавалі круглыя сталы, дыялогавыя пляцоўкі, прыслухаліся да настаўнікаў-практыкаў, якія разумеюць усе праблемы. Наша задача была пачуць прадстаўнікоў усёй вертыкалі кіравання ў сістэме адукацыі, настаўнікаў і, вядома, грамадскасць, нашых бацькоў, — расказала дэпутат парламента.

Нядаўна прайшло пасяджэнне пашыранай групы парламенцкай камісіі з удзелам прадстаўнікоў Адміністрацыі Прэзідэнта, Савета Рэспублікі, Цэнтра прававых даследаванняў, Галоўнага прававога ўпраўлення Палаты прадстаўнікоў, дзе абмяркоўвалі мэтазгоднасць той ці іншай нормы. Такім чынам, прынята ў першым чытанні аўтарская рэдакцыя і рыхтуецца да другога. Асноўныя пазіцыі, можна сказаць, акрэслены.

### Парадак трэба выконваць

Новыя нормы будуць дакладна рэгуляваць адносіны паміж удзельнікамі адукацыйнага працэсу — навучэнцамі, педагогамі і бацькамі. Дарэчы, у першым варыянце некаторыя змены выклікалі пэўны ажыятаж сярод бацькоў.

— Яны не разумелі сутнасць змяненняў, яны вырашылі, што мы пазбаўляем іх права ўдзелу ў адукацыйным працэсе. Мы дапрацавалі норму, дзе гаворыцца, што кіраўнік установы адукацыі разам з органамі самакіравання, куды ўваходзяць і бацькі, вырашаюць, якім чынам бацькі будуць удзельнічаць у адукацыйным працэсе. Гэта значыць, знойміцца з яго ходам, адзнакамі дзяцей, вынікамі вучэбнай дзейнасці, метадыкамі навучання і выхавання. Каб не было сумненняў у бацькоў, мы гэту норму абмеркавалі і дапрацавалі. Яна ў канчатковым варыянце, на мой погляд, будзе спрыяць нармальным адносінам школы і сям'і, канструктыўнаму і давяральнаму ўзаемадзеянню, — адзначыла Лілія Кір'як.

Таксама дапрацаваныя артыкулы, якія датычацца правоў і абавязкаў удзельнікаў адукацыйнага працэсу. Узмоцненыя патрабаванні як да педагогаў, так і да навучэнцаў. Школа — гэта ўстанова са сваімі парадкамі, якія трэба выконваць.

### Толькі сярэдняя адукацыя

Новы кодэкс замацуе сярэднюю адукацыю абавязковай. Як паведаміла прадстаўнік Пастаяннай камісіі, захоўваюцца асноўныя традыцыі, дзе галоўнае — даступнасць кожнага да якаснай адукацыі. Але ёсць і новыя моманты. У прыватнасці, дапрацавана норма, якая дазваляе сумяшчаць дамашняе навучанне са школай. Гэта датычыцца дзяцей, якія маюць пэўныя абмежаванні па медыцынскіх паказчыках. Па новым заканадаўстве яны маюць магчымасць наведваць мерапрыемствы, класныя гадзіны, быць з калектывам, больш сацыялізавацца.

Таксама ў асобны від навучання вылучаецца дыстанцыйная форма, якая раней лічылася завочнай. Зараз яна будзе самастойнай, як і сеткавая форма навучання. У мэтах эканоміі бюджэтных сродкаў можна праходзіць навучанне ў сеткавай форме на базе адной установы.

Правы на адукацыю атрымаюць і тыя непаўналетнія, якія змешчаны ў следчы ізалятар. Змогуць вучыцца і тыя, хто ўжо асуджаны і знаходзіцца ў спецустановах.

### Прынцып інклюзіі

Аднаўлены кодэкс узмоцніць прынцыпы інклюзіі. У сувязі з гэтым з'явіліся новыя артыкулы. Напрыклад, «Працаўладкаванне ў лік броні». Такім чынам, забяспечваюцца сацыяльныя гарантыі выпускнікоў з асаблівасцямі развіцця, абмежаванымі магчымасцямі. Яны атрымліваюць абарону і гарантыю ад дзяржавы ў працаўладкаванні. На сёння сітуацыя іншая.

— Калі няма працоўных месцаў для такой катэгорыі пасля заканчэння сярэдняй спецыяльнай установы альбо ВНУ, яны становяцца на ўлік ва ўпраўленні працы і сацыяльнай абароны, а з цягам часу іх працаўладкоўваюць. Але яны губляюць статус маладога спецыяліста і ўвесь адпаведны сацыяльны пакет. Новая рэдакцыя замацоўвае норму, якая гарантуе працоўнае месца. Такія ж гарантыі атрымаюць і выпускнікі платнай формы навучання, — патлумачыла Лілія Кір'як.

Уводзяцца спецыяльныя нормы для працаўладкавання за кошт броні для дзяцей-сірот, дзяцей, якія засталіся без апекі бацькоў, для асоб з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця, якія атрымалі спецыяльную адукацыю. Калі іх не ўдаецца размеркаваць з-за адсутнасці адпаведных месцаў, у такім выпадку выпускнікам разам з дакументам аб адукацыі будзе выдавацца пасведчанне аб накіраванні на працу на забраніраванае працоўнае месца.

Для юнакоў па жаданні альтэрнатыўная служба ў арміі будзе залічвацца як адпрацоўка маладога спецыяліста. Гэта новая асаблівасць, якая замацоўваецца заканадаўча.

### Меры да наймальніка і статус каледжа

Як расказала дэпутат парламента, уводзіцца норма вяртання бюджэтных сродкаў з боку наймальніка. Гэта адбываецца ў тым выпадку, калі заказчыкі кадраў неабгрунтавана адмовілі ў прыёме на работу выпускніка, які накіраваны ў дадзеную ўстанову. Бюджэтныя сродкі прыйдзецца вярнуць наймальніку і ў выпадку незаконнага звальнення маладога спецыяліста.

Што датычыцца мэтавага накіравання, зноў жа, большая адказнасць кладзецца на заказчыкаў кадраў. Тыя, хто зрабіў дзяржаўны кадравы заказ, але адмовіўся прымаць на работу выпускнікоў прафадукацыі, будуць абавязаныя кампенсаваць кошт навучання дадзенай установе. Згодна з новай рэдакцыяй, адбудзецца аптымізацыя ўстаноў прафтэхадукацыі, усе яны атрымаюць статус каледжаў. Гэта будзе адзіны від такога роду ўстаноў.

### Садкі як прыклад дзяржаўна-прыватнага партнёрства

Як патлумачыла парламентарый, для рэгулявання дзейнасці прыватных навучальных устаноў адукацыі ёсць асобны законапраект «Аб ліцэнзаванні». Між тым новы Кодэкс таксама ўтрымлівае некаторыя нормы адносна прыватнага навучання.

— У новым кодэксе ёсць палажэнне аб частковым дзяржаўным фінансаванні прыватных дашкольных і школьных устаноў адукацыі. Але пры пэўных умовах. Напрыклад, калі ў новым мікрараёне няма месцаў у крокавай даступнасці для дзяцей дашкольнага ўзросту. У такім выпадку прыватная ўстанова пры наяўнасці свабодных месцаў можа ўзяць гэтых дзетак, і дзяржава будзе часткова фінансаваць іх утрыманне, — расказала суразмоўніца.

Гэта дазволіць палепшыць стан з месцамі ў дзіцячых садках, якіх не хапае ў новых мікрараёнах. А з іншага боку, гэта стымул для адкрыцця прыватных устаноў адукацыі. Дарэчы, прадугледжана сацыяльная гарантыя для студэнтаў-платнікаў. Ім, як і бюджэтнікам, можа быць аказана матэрыяльная дапамога за кошт сродкаў даходнай часткі ўстановы адукацыі. Пакуль такая дапамога аказваецца толькі тым, хто вучыцца на бюджэтнай форме.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**

Шляхам жыцця

# ПОСТ, МАЛІТВА ПЛЮС... ВАКЦЫНА

**Як больш эфектыўна супрацоўнічаць медыцыне і праваслаўнай царкве на карысць жыцця, здароўя людзей і грамадства ў цэлым? Пра гэта ішла размова ў Беларускай медыцынскай акадэміі паслядыпломнай адукацыі.**



Многія хваробы вылечваюцца, кажуць часам вернікі, постам і малітваю. Ды, пэўна ж, не ўсе, што пацвярджае чацвёртая хваля эпідэміі каранавіруса. Таму змагацца за здароўе і жыццё хворых неабходна і пры дапамозе вакцыны, і з выкарыстаннем іншых дасягненняў сучаснай навукі, медыцыны. Вызначаны шэраг кірункаў (больш за 40!), паводле якіх разгортваецца сістэмнае аказанне сумеснай дапамогі хворым з боку беларускіх медыкаў і праваслаўных святароў. Як аб'яднаць намаганні, больш эфектыўна супрацьстаяць хваробам — цялесным, душэўным, духоўным — гаварылі падчас пасяджэння Каардынацыйнага савета па распрацоўцы і рэалізацыі сумесных праграм супрацоўніцтва паміж органамі дзяржкіравання і Беларускай праваслаўнай царквой. Прадстаўнікі медыцыны і царквы абмяркоўвалі, як выконваецца прынятая раней Праграма супрацоўніцтва паміж Мінздравам і БПЦ, унеслі прапановы па яе развіцці. Упаўнаважаны па справах рэлігій і нацыянальнасцяў Аляксандр Румак прапанаваў скласці адпаведны план мерапрыемстваў, каб паглыбіць і пашырыць узаемадзеянне.

**Ад 15 да 40 працэнтаў жыццяў удаецца зберагчы дзякуючы перадабортным кансультаванням, якія ўжо 10 гадоў праводзяць у Беларусі гінеколагі, псіхолагі і святары. Найбольш эфектыўна «жыццеабаронцы рух» разгорнуты ў Барысаўскай епархіі — сумесна з Барысаўскім радзільным домам.**

З вуснаў мітрапаліта Мінскага і Заслаўскага Веніяміна, Патрыяршага экзарха ўсяе Беларусі прагучала слова «сопрацоўніцтва» [«соработничество»]. Такі дух супрацы сапраўды панаваў у зале. Кіраўнікі, супрацоўнікі розных цэнтраў і медустаноў, а таксама святары, што займаюцца сацыяльным служэннем, дзяліліся досведам, акрэслівалі перспектыўныя кірункі дзейнасці, болевыя кропкі, дзе сумесныя намаганні найбольш неабходныя: барацьба з наркаманіяй, алкагалізмам і іншымі формамі залежнасці, прафілактыка псіхічных хвароб, прадухіленне суіцыдаў, штучных перарыванняў цяжарнасцяў, паліятыўная дапамога хворым... Поле для сумеснай працы медыкаў і святароў велізарнае, бо рознага роду хвароб, сацыяльных канфліктаў, што могуць іх правакаваць, не становіцца менш. Вельмі важна ў наш час, звярнуў увагу Міністр аховы здароўя Дмітрый Піневіч, умець любы канфлікт пераводзіць у канфлікт канструктыўны, у чым шматвяковы досвед праваслаўнай царквы вельмі каштоўны.

**Іван ЖДАНОВІЧ.**

# Новае абсталяванне для лячэння дзяцей

## Гандлёвая сетка «Санта» перадала Брэсцкай абласной дзіцячай бальніцы відэакалонаскоп апошняга пакалення

**Унікальнае абсталяванне коштам 320 тысяч рублёў рытэйлар набыў за свой кошт і зрабіў падарунак дзіцячай лячэбнай установе. Цяпер для правядзення даследаванняў і бясшоўных аперацый не давядзецца накіроўваць маленькіх пацыентаў у Мінск, як гэта было раней.**

Відэакалонаскоп будзе выкарыстоўвацца для правядзення складаных малаінвазіўных маніпуляцый без адкрытага разрэзу. Гэта дазволіць пазбегнуць страт крыві і знізіць рызыку інфекцый у дзяцей. Пасля такой аперацыі не застаецца шва, а дзіця хутчэй папраўляецца.

— Патрэба ў такім абсталяванні наспела даўно, планы на яго вялікія, — сказаў **галоўны ўрач Брэсцкай абласной дзіцячай бальніцы Сяргей КОЎШЫК.** — Раней дзяцей для такіх маніпуляцый накіроўвалі ў сталіцу, а цяпер з'явілася магчымасць дапамагаць хутка і якасна ў Брэсце. Нягледзячы на тое, што абсталяванне дарагое, такая дапамога дзецям проста бясцэнная.

У штаце ўстановы ўжо ёсць спецыяліст, які прайшоў навучанне, і пасля тэсціравання абсталяванне запусцяць у работу.

**Генеральны дырэктар «Санта Рытэйл» Аляксандр ЧУЙКО** пры перадачы сертыфіката на абсталяванне галоўнаму ўрачу бальніцы адзначыў, што кампанія хутка знайшла пастаўшчыка і даставіла абсталяванне ў краіну:

— Лічым гэта ўкладам у здароўе падрастаючага пакалення і спадзяёмся, што новы апарат дазволіць наблізіць якасць медыцынскай дапамогі нашага рэгіёна да сталічнага ўзроўню.

Варта сказаць, што холдынг «Санта» не першы раз дапамагае медыцыне, летась установам Брэсцкай вобласці перадавалі аўтамабілі хуткай дапамогі, апараты ШВЛ і УГД.

**Яна СВЕТАВА.**

ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена
30 ВЕРАСНЯ 2021 г.
ЧАЦВЕР
№ 18 (15917)
Выдаецца з 21 красавіка 1921 года

Імёны

**Валерый КАНЯХІН:**

# «Стварэнне песні — як нараджэнне дзіцяці»



**Пасля таго як ён скончыў музычную школу па класе фартэпіяна, у творчым лёсе быў вельмі доўгі перапынак. Юнак пачаў спяваць у 16 гадоў і называе сябе «выхадцам з рэстаранаў». Менавіта тады малады эстрадны выканаўца ўвайшоў у самадзейны калектыў «Шчырасць» пры рэспубліканскім інтэрнаце ветэранаў працы і вайны, кіраўніком якога была цяперашняя салістка ансамбля «Свята» Кацярына Балатоўская. Дарэчы, яна не толькі хросная маці таленту і выканаўчага майстэрства спевака Каняхіна, але і хросная яго дачушкі Аліны.**

— Ансамбль народны, у складзе якога адны жанчыны. Я там адспяваў гадоў пяць. Пазнаёміўся з прафесійнымі артыстамі. Стала ўсё гэта мне цікава, даведаўся, што значыць аўтарская песня, — расказвае Валерый.

Вершы ён пачаў пісаць рана. Ужо ў 14-15 мог зарыфмоўваць радкі, але, як гаворыць, укладаць у іх нейкі сэнс не дазваляў узрост, не хапала жыццёвага вопыту. Можа, таму ўвесь час і цягнуўся да дарослых, з якімі заўсёды цікава.

— У мяне сябры ва ўзросце ад 45 гадоў, з імі вельмі камфортна. Мне падабаецца, што гэты ўзрост мяне ўспрымае. Хоць усе розныя, аднак у нас ёсць агульныя захапленні. Напрыклад, сябрую з Таццянай Волкавай, яна адвакат, але яшчэ і аўтар-выканаўца, піша песні і выступае. Па родзе дзейнасці мы з ёй розныя, але, сустрэўшыся, можам размаўляць дзве гадзіны, — дзеліцца спявак.

І, сапраўды, як расказвае сам герой, у коле яго сяброў самыя розныя людзі, сярод якіх і чыноўнікі, і дырэктары, і нават мільянеры. Ганарыцца Валерый сяброўствам з Уладзімірам Матусевічам, генеральным дырэктарам «Хёндэ АўтаГрад», былым палкоўнікам міліцыі, а цяпер і аўтарам вершаў дзвюх яго песень. Шануе спявак і сяброўства з Валерыем Сарокам, пісьменнікам, які здымае кіно пра цікавых людзей, — вось і пра Валерыя Каняхіна ён таксама марыць зняць фільм. А сяброўства і супрацоўніцтва Валерыя з легендай беларускай сцэны Надзеяй Мікуліч доўжыцца вось ужо восем гадоў.

— У нас добры сяброўскі тандэм: калі ёй неабходна дапамога, я з вялікім задавальненнем дапамагаю. Яна, можна сказаць, хакер: у яе ёсць усе сучасныя праграмы, калі трэба мне нешта — дашле ўмомант. Яна ў гэтым плане сучасная. Калі я напісаў песню, Надзея Мікуліч — сканер, пакуль не скажа мне ісці на студыю, я не пайду, — усміхаецца Валерый. — Дзякуючы Надзеі Анатольеўне, у мяне з'явілася пэўная ступень пазнавальнасці. З легендай, з заслужанай артысткай у пачатку сваёй творчай кар'еры я спяваў перапеўкі, яна дазваляла ў сваім канцэрце выканаць мне чатыры-пяць песень, гэта дарагога варта.

*(Заканчэнне на 4-й стар. «ЧЗ».)*

Рэальныя мэты

# ДОБРА БЫЦЬ ЭЛІТАЙ

## Малады вучоны? Дапаможам камерцыялізаваць ідэі!

**Міжнародная навуковая канферэнцыя «Моладзь у навуцы — 2021» праходзіць гэтымі днямі ў Нацыянальнай акадэміі навук з удзелам 250 маладых даследчыкаў. Гэта не толькі найбуйнейшае навуковае мерапрыемства ў нашай краіне, але і прэстыжная пляцоўка для прэзентацыі праектаў таленавітай моладзі з краін СНД, блізкага і далёкага замежжа.**



### ПЕРАЕМНАСЦЬ ПАКАЛЕННЯЎ

— Для інавацыйнай эканомікі развіццё навукі і тэхналогій з'яўляецца адной з найважнейшых перадумоў. Вядома, для таго, каб мы істотна прасунуліся ў гэтым кірунку, патрабуецца падтрымка маладых навукоўцаў і ўвогуле маладзёжных ініцыятыў, накіраваных на стварэнне новых прадуктаў, — падкрэслівае **галоўны вучоны сакратар і старшыня Савета маладых вучоных Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі Андрэй ІВАНЕЦ.** — У Акадэміі навук сёння створана цэласная сістэма падтрымкі маладых навукоўцаў, якая ўключае ў тым ліку магчымасці атрымання стыпендый і грантаў.

Так, тры гады таму быў заснаваны конкурс «100 маладых талентаў Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі». Удзельнічаць у ім могуць маладыя навукоўцы, якія абаранілі кандыдацкую дысертацыю ва ўзросце да 30 гадоў або атрымалі навуковую ступень доктара навук ва ўзросце да 40 гадоў. Яны ўжо маюць вопыт кіраўніцтва шэрагам навуковых праектаў, працуюць з магістрантамі, аспірантамі, фарміруюць маладзёжныя каманды. Гэта наш кадравы рэзерв. Маладыя вучоныя, якія ўвайшлі ў банк даных «100 маладых талентаў» за мінулыя тры гады істотна прасунуліся ў сваёй навуковай і адміністрацыйнай дзейнасці. Многія з іх ужо займаюць кіруючыя пасады ў навуковых арганізацыях і лабараторыях. Такім чынам, конкурс стаў дзейсным інструментам, які дапамагае ініцыятыўным і таленавітым маладым людзям развівацца ў навуцы.

*(Заканчэнне на 2-й стар. «ЧЗ».)*

У ліку найпершых

# «ХОЧАЦЦА ВЯРНУЦЦА Ў ТЫЯ ЦУДОЎНЫЯ ДНІ»,

## або Як «Дойліды» скарылі Кузбас

**Па выніках працы на Міжнароднай студэнцкай будоўлі «Кузбас-300» у расійскім горадзе Кемераве студэнцкі будаўнічы атрад «Дойліды» імя П. І. Блахіна Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта стаў найлепшым. Беларускія студэнты разам з расійскімі і казахскім будатрадамі ўдзельнічалі ва ўзвядзенні спартыўных і сацыяльных аб'ектаў капітальнага будаўніцтва Кузбаса. Камандзір атрада чацвёртакурснік механіка-тэхналагічнага факультэта спецыяльнасці «Хімічная тэхналогія перапрацоўкі прыродных энерганосьбітаў» Уладзіслаў КОНАХАЎ расказаў, што на міжнароднай будоўлі сабраліся 18 атрадаў, канкурэнцыя была сур'ёзная, аднак «Дойліды» адчувалі сябе ўпэўнена.**

*(Заканчэнне на 3-й стар. «ЧЗ».)*



Фота з архіва героя.

# ДОБРА БЫЦЬ ЭЛІТАЙ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)*

Пры ўмове здавальняльнай ацэнкі гадавой справаздачы аб навукова-даследчай, педагагічнай і інавацыйнай дзейнасці лаўрэатам конкурсу выплачваецца штогадовая прэмія ў памеры да 50 базавых велічынь у перыяд уваходжання ў банк даных «100 талентаў Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі». Кандыдаты навук могуць знаходзіцца ў банку да 35-гадовага ўзросту, а дактары навук — да 45 гадоў.

Акрамя таго, у 2019 годзе былі заснаваныя некалькі імянных прэмій для маладых навукоўцаў: прэмія імя акадэміка Жарэса Алфёрава (у галіне фізікі, матэматыкі, інфарматыкі, фізіка-тэхнічных і тэхнічных навук), акадэміка Васілія Купрэвіча (у галіне біялогіі, хіміі і навук аб Зямлі, медыцыны і аграрных навук) і першага прэзідэнта Акадэміі навук Усевалада Ігнатоўскага (у галіне гуманітарных і сацыяльных навук).

«Акрамя матэрыяльнага стымулу, вельмі важна, каб моладзь адчувала пераемнасць, а імянныя стыпендыі якраз і дазваляюць паглыбіцца ў гісторыю Нацыянальнай акадэміі навук і стаць да яе датычнымі. Сёння маладыя вучоныя да 35 гадоў складаюць прыкладна 30 працэнтаў ад агульнай колькасці работнікаў ва ўсіх структурах Нацыянальнай акадэміі навук. Ступені кандыдата і доктара навук маюць з іх 12—15 працэнтаў. Многа гэта ці мала? Вядома, нам хацелася б, каб матывацыя да абароны, у першую чаргу, кандыдацкай дысертацыі была больш высокая, — канстатуе Андрэй Іванец, — але заробкі навукоўцаў залежаць не толькі ад наяўнасці ў іх вучонай ступені, але і ад узроўню праектаў, у якіх яны задзейнічаны, і аб'ёму іх фінансавання.

## ПРАФЕСІЙНЫЯ АМБІЦЫІ

Падрыхтоўкай інтэлектуальнай эліты на ўзроўні магістратуры, аспірантуры і дактарантуры займаецца Інстытут падрыхтоўкі навуковых кадраў НАН. Для гэтых мэт задзейнічана матэрыяльна-тэхнічная база ўсіх арганізацый акадэміі, якая з'яўляецца найбуйнейшай навукова-тэхнічнай карпарацыяй у краіне. Фарміраванне будучых вучоных адбываецца не ў вучэбных аўдыторыях, а, так бы мовіць, на перадавой акадэмічнай навукі — у лабараторыях акадэмічных інстытутаў і навукова-практычных цэнтраў, на эксперыментальных пляцоўках, археалагічных раскопках. Цяпер у Акадэміі навук праграмы аспірантуры рэалізоўваюцца ў 52 навуковых арганізацыях па 137 навуковых спецыяльнасцях.



А якімі ж матывамі кіруецца моладзь, каб пайсці вучыцца спачатку ў магістратуру, а потым і ў аспірантуру? Як паказваюць апытанні, гэта жаданне самаўдасканальвацца, магчымасць займацца навуковай дзейнасцю, прасоўванне па кар'ернай лесвіцы, імкненне працаваць у навуковай установе ці вышэйшай навучальнай установе, павысіць свой сацыяльны статус і самасцвердзіцца.

Зразумела, эфектыўнасць аспірантуры ў вялікай ступені залежыць ад таго, хто туды паступае, якія мэты і задачы ставіць перад сабой будучы вучоны: проста абараніць дысертацыю або адбыцца ў навуцы? Чым жа прыцягвае маладых навучанне ў акадэмічнай аспірантуры? У першую чаргу гэта пашырэнне свайго навуковага кругагляду: размова ідзе пра магчымасць адкрываць новыя галіны ведаў, інтэлектуальны рост, магчымасць стасункаў з дзеячамі навукі, аспірантамі з іншых аддзелаў і лабараторый. Акадэмічныя аспіранты канстатуюць, што даследчая дзейнасць дазваляе ім дысцыплінаваць мысленне.

Як сцвярджае старшыня Савета маладых вучоных Андрэй Іванец, праблема з забеспячэннем моладзі жыллём у Акадэміі навук вырашаецца добра. Так, магістранты і аспіранты на 100 працэнтаў забяспечаны месцамі ў інтэрнаце. Прычым жыллё знаходзіцца ў крокавай даступнасці ад Акадэмгарадка, што вельмі зручна пры падрыхтоўцы магістарскіх работ і кандыдацкіх дысертацый. Для маладых вучоных праблема таксама вырашаецца комплексна: ёсць інтэрнат і арэнднае жыллё ў комплексе «Магістр». Ёсць таксама асобны дом для маладых вучоных, які быў пабудаваны па ўказе кіраўніка дзяржавы. Зараз чаргі ў інтэрнат ці на арэнднае жыллё ў акадэміі няма. «Але моладзь цяпер хоча мець уласнае жыллё, таму мы працуем у гэтым кірунку: праведзены праектныя работы і зроблена закладка жылога дома на перакрыжаванні вуліц Прагрэсістаў і Акадэміка Купрэвіча, куды змогуць засяліцца як маладыя вучоныя, так і старэйшае пакаленне», — дадаў Андрэй Іванец.

## УНІКАЛЬНЫ ШАНЦ

— Беларускі нацыянальны тэхнічны ўніверсітэт з'яўляецца лідарам тэхнічнай адукацыі ў нашай краіне, і выхаванне крэатыўнай моладзі, фарміраванне культуры інавацыйнага прадпрымальніцтва ў маладзёжным асяроддзі — адна з яго прыярытэтных задач, — падкрэслівае **дырэктар філіяла БНТУ «Навукова-даследчы політэхнічны інстытут» Віктар ТРАПАЧКА.** — У сучасных рэаліях вучоны павінен не толькі генерыраваць ідэі, але і ўмець арганізаваць навуковае даследаванне, сфарміраваць навуковую групу, падумаць, каму могуць быць цікавыя вынікі гэтага даследавання. На працягу апошніх сямі гадоў універсітэт удзяляў значную ўвагу стварэнню інавацыйнай інфраструктуры, якая дапамагала б моладзі не толькі задумаць свой праект, але і давесці яго да практычнай рэалізацыі, у тым ліку арганізаваць уласны бізнес. Для гэтага ў БНТУ створана ўнікальнае асяроддзе, якое ўключае шэраг элементаў.

Першы — гэта студэнцкія навукова-даследчыя лабараторыі. Іх ва ўніверсітэце дваццаць, створаны яны ў розных галінах рэальнага сектара эканомікі: гэта і энергетыка, і машынабудаванне, і будаўніцтва, і горная справа. З 20 лабараторый шэсць атрымлівалі падтрымку на развіццё сваёй матэрыяльнай базы ад спецыяльнага фонду Прэзідэнта па падтрымцы таленавітай моладзі.

У 2014 годзе ў БНТУ быў створаны Стартап-цэнтр. Гэта самы інавацыйны і маладзёжны праект універсітэта, унікальны шанц для тых, у каго ёсць ідэі для стварэння і развіцця ўласнага бізнесу, а таксама для тых, чые камандныя і лідарскія здольнасці дапамогуць рэалізацыі творчых задум і планаў іншых удзельнікаў. Місія стартап-школы — развіццё культуры маладзёжнага прадпрымальніцтва ў БНТУ, падтрымка бізнес-актыўнасці маладых навукоўцаў і, вядома, пошук цікавых стартапаў. У цэнтры праводзіцца шэраг тэматычных мерапрыемстваў (мітапы і прэзентацыі праектаў, семінары і бізнес-гульні), аказваецца кансультаванне па пытаннях прававой аховы і кіравання інтэлектуальнай уласнасцю, поўны комплекс інфармацыйна-маркетынгавых паслуг для арганізацыі інавацыйнага бізнесу.

Паколькі БНТУ — тэхнічная ВНУ, таму і стартапы тут — пераважна «прадуктовыя». Падчас правядзення стартап-школы з'явілася дакладнае разуменне, што стартаперам-пачаткоўцам патрабуецца дапамога, у першую чаргу з фізічнай візуалізацыяй іх ідэй.

Напрыклад, вы загарэліся ідэяй стварэння шматфункцыянальнай прылады, якая можа палегчыць жыццё. Вы лічыце гэта выдатным вынаходствам, прыдумалі канцэпцыю і думаеце, што ваш прадукт будзе цікавы рынку. Але што паказаць інвестарам? Патрэбны ўзор! Усе гэтыя пытанні вырашае Фаблаб. Дзякуючы сучаснаму абсталяванню і цалкам новым падыходам да хуткага мадэлявання і прататыпавання ў вытворчай лабараторыі можна прайсці ўсе стадыі — ад распрацоўкі ідэі да гатовага камерцыйнага прадукту.

Усяго Фаблаб валодае двума дзясяткамі адзінак абсталявання: гэта 3D-прынтары з камплектам інструментаў для абслугоўвання, фрэзерна-гравіравальны станок, лазерны гравіравальна-рэжучы станок, канструктары для зборкі робатаў і электрапраграмаваных прылад, абсталяванне для слясарных і мантажных работ і гэтак далей. Акрамя тэхнічнай аснашчанасці, Фаблаб можа пахваліцца правядзеннем майстар-класаў (напрыклад, па 3D-мадэляванні), якія дазваляюць пашырыць творчыя магчымасці карыстальнікаў. Наведвальнікі могуць працаваць самастойна або сумесна з ментарам. Практыкуецца падыход, калі вопытныя карыстальнікі ўключаюцца ў працу ў якасці ментараў. Фаблаб лагічна ўбудаваўся ў сістэму падтрымкі і развіцця інавацый універсітэта, заняўшы ў ёй сваё месца.

## БЫЦЬ У ТРЭНДЗЕ

Як расказаў Віктар Трапачка, кліентамі Стартап-цэнтра былі 34 праекты, з іх шэсць маюць устойлівы бізнес. Гэта вельмі добры паказчык, таму што па сусветнай статыстыцы толькі два працэнты кліентаў стартапаў праз пэўны час арганізуюць паспяховы бізнес.

Адным з самых першых праектаў Стартап-цэнтра БНТУ стаў робат багі, які ў выніку вырас у серыю набораў для адукацыйнай робататэхнікі і кампанію «МРобат». Адзін з самых вядомых стартап-праектаў — «ТурбаСфера» — накіраваны на вырашэнне праблемы ўтылізацыі энергіі залішняга ціску прыроднага газу і больш эканомнага выкарыстання рэсурсаў. «ТурбаСфера» можа атрымліваць энергію з другасных энергарэсурсаў і цеплавых адходаў. Тэхналогія паказала сябе працаздольнай, бяспечнай і прыносіць даход. На дадзены момант выпускнік энергетычнага факультэта БНТУ Кірыл Ляўкоў, які калісьці прыйшоў са сваёй ідэяй у Стартап-цэнтр, стварыў ужо тры прадпрыемствы — у Навукова-тэхналагічным парку БНТУ «Палітэхнік», у Сколкаве (Расійская Федэрацыя) і ў Навукова-тэхналагічным парку Беластока.

Яшчэ адзін прыклад паспяховай інавацыі звязаны з вышыўкай. Сёння дызайн-цэнтр вышыўкі Fainy.by — самае буйное прадпрыемства на рынку паслуг па гэтым профілі. А пачалося ўсё з ідэі абзавесціся ўласным карпаратыўным стылем па аналогіі з сусветнымі ўніверсітэтамі. У каманду аб'ядналіся студэнты некалькіх факультэтаў, якія самастойна распрацавалі дызайнерскі лагатып універсітэта і спыніліся на ідэі яго вышыўкі: глядзіцца сучасна і прэзентабельна. Атрымалася дастойная калекцыя. Далей узнікла ідэя папрацаваць з нацыянальным арнаментам, які ў трэндзе і асабліва запатрабаваны сярод моладзі. Для кожнага малюнка пішацца індывідуальная камп'ютарная праграма. Затым прыйшло разуменне, што з гэтага праекта можна арганізаваць самастойны бізнес. З'явіўся інтэрнэт-крама, а затым стартап перавялі ў ТАА «Дызайн-цэнтр вышыўкі» — адзін з рэзідэнтаў тэхнапарка БНТУ «Палітэхнік».

*Нечакана!*

# Дадай сваё... «УКантакце»

**Першакурснік факультэта прыкладной матэматыкі і інфарматыкі БДУ Яўген Стэфанкоў перамог у конкурсе «VK Cup» у намінацыі «Mobile». Студэнт распрацаваў дадатак для праслухоўвання падкастаў у сацыяльнай сетцы «УКантакце», дзе карыстальнікі могуць пакідаць «хуткія рэакцыі» ў выглядзе смайлікаў або невялікай тэкставай нататкі, а ствральнікі гукавога файла — сачыць за статыстыкай рэакцый слухачоў.**

Чэмпіянат «VK Cup» праводзіўся ў чатырох намінацыях: «Mobile» (мабільная распрацоўка), «Engine» (спартыўнае праграмаванне), «Design» (дызайн інтэрфейсаў), «ML» (машыннае навучанне). Удзельнікамі сталі больш за 1000 рускамоўных IT-спецыялістаў ва ўзросце ад 16 да 42 гадоў, і толькі 128 з іх прайшлі ў фінал. У кожным з кірункаў было сем прызавых месцаў. Дарэчы, 17-гадовы Яўген Стэфанкоў стаў самым маладым пераможцам конкурсу, апярэдзіўшы ў інтэлектуальный гонцы вопытных спецыялістаў.

У рамках конкурснай праграмы ўдзельнікам прапаноўвалася вырашыць задачы па пашырэнні ў перспектыве функцый «УКантакце». Так, у адборачным туры канкурсанты намінацыі «Mobile» выконвалі заданні па стварэнні дадатку для апрацоўкі галасавых паведамленняў з эфектамі закадравага смеху, праектавалі інтэрфейс выкліку таксі, вызначалі ўзрост карыстальнікаў па іх паводзінах. У фінальным паядынку ўдзельнікі на працягу тыдня распрацоўвалі дадатак для праслухоўвання падкастаў.

Пераможцаў вызначалі IT-спецыялісты каманды «УКантакце» праз тэсціраванне працаздольнасці дасланых праектаў.

Чэмпіянат найлепшых распрацоўшчыкаў і дызайнераў «VK Cup» праводзіцца штогод камандай сацыяльнай сеткі «УКантакце» з 2012 года. Конкурс аб'ядноўвае найлепшых IT-спецыялістаў для пашырэння і распрацоўкі новага функцыяналу сацыяльнай сеткі, вывучэння сучасных тэндэнцый IT-рынку, стварэння ўмоў для развіцця маладых распрацоўшчыкаў і магчымасці іх працаўладкавання ў IT-кампаніі. Яго ўдзельнікамі з'яўляюцца рускамоўныя праграмісты-спартсмены, дызайнеры інтэрфейсаў, спецыялісты па машынным навучанні і стваральнікі мабільных праграм ва ўзросце ад 16 гадоў.

**Матэрыялы падрыхтавала Надзея НІКАЛАЕВА.**

*Майстар-клас*

# АНІМАЦЫЯ ЯК ТРАМПЛІН

**Ведаеце, які зараз адзін з найбольш актуальных трэндаў у сацсетках? Мабільная анімацыя. Наша гераіня Аляксандра ЖУРОМСКАЯ зацікавілася ёй амаль два гады таму, і зараз гэты занятак для дзяўчыны не проста хобі, а работа па душы.**

— Я з Мазыра, але зараз жыву ў Мінску. З дзяцінства думала, што стану вядомай спявачкай, аднак лёс распарадзіўся па-іншаму, — расказала наша суразмоўніца. — Скончыла Мінскі дзяржаўны лінгвістычны ўніверсітэт, паралельна адвучылася на візажыста. Але пайшла ў грамадскае харчаванне, дзе прапрацавала дзесяць гадоў: афіцыянткай, метрдатэлем у адным з вядомых рэстаранаў сталіцы. З абавязкамі спраўлялася добра, была магчымасць развівацца ў гэтай сферы, аднак мне заўсёды хацелася рэалізаваць менавіта свой творчы патэнцыял. Таму ў мінулым годзе прыняла рашэнне звольніцца і пачала рабіць відэа- і фотакантэнт для сацсетак знаёмых, сяброў. Хутка да мяне звярнулася сяброўка, якая прапанавала весці профіль у Instagram яе рэстарана. Пагадзілася, але не думала, што змагу гэтым зарабляць, да таго ж адчувала шмат няўпэўненасці. Але мне вельмі падабалася ствараць прыгожыя відэаролікі, таму не спынялася ў развіцці.

Заказчыкі пачалі прыходзіць да Сашы з прапановамі супрацоўніцтва амаль адразу. Яна самастойна вывучала сферу мабільнай анімацыі, разбіралася і эксперыментавала з дадаткамі.

— Анімацыя стала для мяне трамплінам да дарослага і самастойнага жыцця. З гэтым было не вельмі складана, таму што асабістыя сацсеткі я актыўна вяду яшчэ з юнацтва. Ужо правяла каля дзесяці вэбінараў па мабільнай анімацыі, майстар-класы, выпусціла некалькі патокаў вучаніц аўтарскага курса. Каб усё атрымалася, з раніцы да ночы па 18—20 гадзін на працягу некалькіх месяцаў рыхтавала якасны кантэнт, напрацоўвала ўласныя «фішкі». І цяпер падпісчыкі і вучаніцы адзначаюць, што мае работы не падобныя на іншыя, адрозніваюцца асаблівай эстэтыкай і складанасцю выканання. Над кожным сваім праектам працую доўга, педантычна прадумваю кожную дэталь, кадр, таму ролікі выглядаюць цэласна і дынамічна. Акрамя таго, для мяне важна расставіць правільныя акцэнты ў музыцы. Таму можна сказаць, што для ўдалага выніку я не шкадую ні часу, ні сіл.



Аляксандра супрацоўнічае з вядомымі беларускімі і замежнымі брэндамі. Дзяўчына прызнаецца, што яна — самы строгі для сябе крытык...

— Шчыра кажучы, асабліва з крытыкай я не сутыкалася, і для мне гэта прыемна. Да таго ж чым больш напрацоўвала вопыт, тым больш станавілася ўпэўненай у сваіх сілах. Лічу сябе гнуткай у рабоце: калі заказчык патрабуе — магу перарабіць або падкарэкціраваць відэаролік колькі трэба разоў. На стварэнне аднаго 15- або 30-секунднага ў мяне сыходзіць прыкладна пяць гадзін. Памятаю, аднойчы рабіла двух- і чатырохххвілінныя відэа, тады спатрэбілася каля двух тыдняў. Гэта да таго, што не так усё проста, як падаецца на першы погляд. Каб рабіць такія ролікі, патрабуецца добрая тэхніка — раю карыстацца Iphone, ён больш падыходзіць для работы, там нашмат больш патрэбных функцый і інструментаў. А таксама трэба мець пачуццё густу, нагледжанасці і жаданне развівацца, тварыць.

Саша расказала, што, для таго каб пачаць зарабляць на мабільнай анімацыі, хопіць усяго трох мабільных дадаткаў: Bazart (відэарэдактар), Videoleap (фотарэдактар), Motionleap (для апрацоўкі дэталяў).

— Для многіх з тых, хто навучаецца мабільнай анімацыі, вялікую цяжкасць складае актыўнае вядзенне сацсетак. Але трэба разумець: зараз блогінг выйшаў на іншы ўзровень, змяніліся «правілы гульні», таму гэтаму абавязкова трэба вучыцца. Мала ведаць асновы мабільнай анімацыі, варта яшчэ і ўнікаць у маркетынг, блогінг, законы прасоўвання ў Instagram. Я люблю сацсеткі і адчуваю сябе там як рыба ў вадзе.

## Да дарослага і самастойнага жыцця

Здымаць сторыз, рабіць фота- і відэакантэнт для мяне ў радасць. Штодзень публікую цікавы кантэнт, афармляю калажы, дапамагаю весці розныя камерцыйныя профілі, падтрымліваю зваротную сувязь са сваімі вучаніцамі. З такім хуткім рытмам перыядычна выгараю, аднак з-за таго, што ёсць вялікае жаданне вывесці свой брэнд на новы ўзровень, у якім бы я ні была настрої, бяру сябе ў рукі і іду далей. У мяне пакуль няма сваёй каманды, дзесьці ўнутры яшчэ сядзіць праблема пад назвай «зраблю ўсё сама», але ў далейшым усё ж такі планую дэлегіраваць бізнес-частку свайго занятку іншым спецыялістам, каб у мяне было больш часу на творчасць.

Саша кажа, што настройвацца на правільны рабочы лад ёй дапамагае прырода, добрая музыка і медытацыі. «Але на гэта ўсё застаецца вельмі мала часу. У мяне ёсць дакладная мэта — развіваць асабісты брэнд, маштабаваць яго і актыўна і якасна прасоўвацца ў сацсетках».

**Дар'я ШЛАПАКОВА.**
**Фота з архіва гераіні.**



*Лакацыі актыўнасці*

## Запросіць «Лянок»

**Новы працоўны вытворчы праект пад такой назвай з удзелам студэнцкіх атрадаў плануюць рэалізаваць у 2022 годзе Рэспубліканскі штаб студэнцкіх атрадаў БРСМ і Аршанскі льнокамбінат, паведамілі ў Цэнтральным камітэце Саюза моладзі.**

Такое рашэнне прыняло кіраўніцтва прадпрыемства і Рэспубліканскі штаб студэнцкіх атрадаў падчас наведвання Аршанскага льнокамбіната ўдзельнікамі рэспубліканскага семінара студатрадаў.

Паўдзельнічаюць у вытворчым працоўным праекце «Лянок» 50 чалавек. Аснову студатрада складуць навучэнцы Аршанскага дзяржаўнага прафесійнага ліцэя тэкстыльшчыкаў імя Г. В. Сямёнава. Па конкурсе, пасля папярэдняга навучання асновам прафесіі ў ліцэі, байцамі зводнага вытворчага атрада стануць таксама хлопцы і дзяўчаты з найбліжэйшых раёнаў — Дубровенскага, Талачынскага, Сенненскага. На працягу месяца яны будуць працаваць у другім і трэцім прадзільных цэхах камбіната прадзільшчыкамі мокрага прадзення. Заработная плата будзе залежаць ад выпрацоўкі. Галоўнае — не ленавацца. Прадпрыемства зацікаўлена ў маладых работніках, бо патрэба ў прадзільшчыках высокая. Таму ў моладзі з'явіцца магчымасць у будучыні атрымаць пастаянную працу, мяркуюць арганізатары праекта.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

# «ХОЧАЦЦА ВЯРНУЦЦА Ў ТЫЯ ЦУДОЎНЫЯ ДНІ»...

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)*

— Адпрацавалі мы на будаўніцтве культурнага кластара ў Кемераве амаль два месяцы. Шчыравалі на аб'екце, дзе будаваўся аддзел харэаграфіі і спеваў. Па прыездзе хутка сарыентаваліся і ўключыліся ў працу, бо будоўля «Кузбас-300» вельмі падобная на Усебеларускую маладзёжную. Усяго нас было 15 чалавек: 14 хлопцаў і адна дзяўчына. Хтосьці тынкаваў і аздабляў сцены, нехта клаў керамічную плітку або працаваў у якасці падсобнага рабочага. Жылі ў інтэрнаце Кемераўскага дзяржаўнага ўніверсітэта, які размяшчаўся зусім недалёка ад нашага аб'екта.



«Дойліды» былі ўпэўнены: гэтая будоўля стане вельмі складанай як фізічна, так і маральна. «Спачатку наваічкам было цяжкавата ўключыцца ў працэс. Тут галоўнае — не ўпусціць момант, калі яны пачнуць «тухнуць», здавацца, і своечасова падбадзёрыць. Разам з тым мы разумелі, што побач з намі вельмі моцныя будатрады з Расіі і Казахстана. Але іншыя хлопцы і дзяўчаты нас вельмі падтрымлівалі, мы пасябравалі, і нават цяпер з многімі захавалася цесная сувязь. Разам было нашмат лягчэй рушыць наперад і займацца падрыхтоўкай да розных мерапрыемстваў, спаборніцтваў. Да таго ж расіяне не чакалі такога высокага ўзроўню падрыхтоўкі «Дойлідаў». Калі нас аб'явілі найлепшымі па выніках працы на гэтай будоўлі, эмоцыі перапаўнялі», — падзяліўся Улад.

21-гадовы хлопец кажа, што матывацыя ўдзелу ў будатрадах ва ўсіх розная. «Асабіста я ўступіў у студатрад, бо хацеў паспрабаваць нешта новае. Было гэта два гады таму. Спачатку паехаў на Усебеларускую маладзёжную будоўлю ў Астравец байцом. Пасля першай «цаліны» мяне вельмі прыцягнуў студатрадаўскі рух, і я стаў камісарам на наступны год. А ўжо на трэці мяне выбралі камандзірам. Я вельмі таварыскі, камунікабельны, знаходжу агульную мову практычна з любым чалавекам, ніколі не баюся адказнасці. Лічу сябе творчай асобай і, прыйшоўшы ва ўніверсітэт, раскрыў гэты свой патэнцыял яшчэ больш. На жаль, ужо не змагу больш ездзіць на «цаліну» разам з будатрадам, бо гэты год — мой апошні ў ВНУ, аднак калі б была такая магчымасць, не раздумваючы, пагадзіўся б і надалей займацца такой дзейнасцю».

**Камісар «Дойлідаў» студэнт спецыяльнасці «Арганізацыя дарожнага руху» Мікіта БОНДАР** уступіў у будатрад яшчэ тры гады таму, а на Міжнародную будоўлю паехаў ужо ў якасці камісара.

— Я вельмі творчы чалавек, у свой час скончыў мастацкую школу. Да таго ж люблю спорт. Да Міжнароднай студэнцкай будоўлі мы рыхтаваліся грунтоўна, упершыню паехалі ў Расію на такі маштабны аб'ект. Трапілі туды не ўсе, хоць ахвотных было шмат. Менавіта я адказваў за арганізацыю творчых і спартыўных мерапрыемстваў, за тое, каб наш атрад за час трэцяга працоўнага семестра стаў вялікай дружнай сям'ёй. Займаліся ўборкай будаўнічага смецця, залівалі падлогу бетонам, выконвалі іншыя справы. Пасля працы рыхтаваліся да спаборніцтваў або конкурсаў. З камандзірам замянялі адзін аднаго калі гэта было патрэбна. Не ўсё адразу атрымлівалася, але мы ўсяму хутка вучыліся. Падымаліся рана, але гэта было не адчувальна з-за насычаных дзён. Імкнуліся правільна планаваць час. На будоўлі абвастраецца жаданне ствараць, генераваць новыя ідэі. Чаго толькі не рабілі, нават здымалі кліп! Больш за ўсё ўразіў творчы фестываль, пасля яго атрымаў станоўчыя эмоцыі.

20-гадовы Мікіта падзяліўся, што адзін з самых любімых момантаў будоўлі — закрыццё трэцяга працоўнага семестра. «Адразу ўспамінаеш яркія моманты, якіх вынікаў дасягнулі. Шчыра кажучы, мы не былі ўпэўненыя на сто працэнтаў, што станем найлепшымі па выніках працы ў Кемераве. Гэтая ўзнагарода — вельмі значная для нас. Увогуле, мае родныя і сябры заўсёды падтрымлівалі ў тым, што я ўдзельнічаю ў будатрадзе. Гэта добрая магчымасць падарожнічаць, заводзіць новыя знаёмствы, развіваць свае навыкі. Калі трапляеш у студатрад — гэта назаўжды. Нават праз доўгія гады, як расказвае нам больш дарослае пакаленне студатрадаўцаў, ты вельмі хочаш заставацца яго часткай, вярнуць цудоўныя дні. Хацелася б працягваць гэтым займацца, але я ўжо выпускнік».

**Дар'я ШЛАПАКОВА.**
**Фота з архіва герояў.**

SEX-БАЛЯСЫ

# «ТАМУ ШТО Я — ДЗЯЎЧЫНКА!»

**Пачнём з любімага — з анекдота. Бацька кажа дачцэ: «І запомні: калі толькі хто пачне да цябе чапляцца — адразу бі яго рыдлёўкай!» Тая ў адказ: «Тата, ты што?! Я ж дзяўчынка!!!» Бацька: «Добра, я куплю табе ружовую!» Дык вось, нашы сённяшнія нататкі — пра «такіх» і «не такіх» прадстаўніц прыгожага полу. («Калі б мужчынскія мары аб ідэальнай жанчыне збываліся, па вуліцах хадзілі б ногі, грудзі і рот, заклеены пластырам».) А канкрэтна нагодай стала гісторыя пра дзяўчыну з Санкт-Пецярбурга, якая здзейсніла дарожна-транспартнае здарэнне, а потым папрасіла суд не пазбаўляць яе правоў кіроўцы па той прычыне, што яна... «дзяўчынка». Ні больш, ні менш.**

Кацярына Голубева атрымала правы ў ліпені. Праз сем дзён у 2.05 яна на арандаванай машыне ўрэзалася ў прыпаркаванае аўто. З месца ДТЗ дзяўчына знікла, аднак праз час вярнулася з сябрамі. Кампанія агледзела аўтамабіль і таксама з'ехала. («Надпіс над знакам «Абгон забаронены»: «Паважаныя жанчыны, дадзены знак распаўсюджваецца не толькі на машынкі чырвонага і чорнага колераў!!!») Пры гэтым ніякіх асабістых даных пра сябе Голубева не пакінула. Суд прыцягнуў дзяўчыну да адміністрацыйнай адказнасці за невыкананне абавязкаў у сувязі з ДТЗ і пазбавіў яе правоў на год. Сама Голубева патлумачыла, што прызнае віну і раскайваецца ў зробленым. Як сказала кіроўца, яна пакуль не адчувае габарытаў. («А ў ложку яна была сапраўднай тыгрыцай: рыжая, 150 кілаграмаў, з вусамі».) «Я ж дзяўчынка, мне трэба даравать», — гэтымі словамі Голубева завяршыла сваё выступленне.



Яшчэ вось такая гісторыя ў тэму. TikTok-блогерка Джэйд Алізэ таемна зняла канец сустрэчы на відэа і вырашыла больш не адказваць мужчыну, які з'ехаў адразу пасля спаткання. У ролiку відаць, як дзяўчына падышла з вуліцы да сваіх дзвярэй. Адначасова з гэтым ад дома ад'ехаў аўтамабіль. («— Не ведаю, ісці з ім на спатканне ці не?» — «Ды схадзі, паеш, ты чаго».) Як патлумачыла Алізэ, на гэтай машыне з'ехаў мужчына, з якім яна хадзіла на рамантычную сустрэчу. Ёй вельмі не спадабалася, што кавалер не дачакаўся, пакуль яна дойдзе да дзвярэй і не зойдзе ўнутр. «Гэта другі «чырвоны сцяжок». Цяпер я знікаю», — сказала раззлаваная жанчына. У каментарыях яна дадала, што першым «чырвоным» сцяжком сталі паводзіны мужчыны на спатканні: ён не адкрыў перад ёй ні адны дзверы. («Парады псіхолага. Хочаш убачыць чорнае карункавае? Падлівай чырвонае паўсалодкае!..») Большасць гледачоў усталі на бок Алізэ. «Нават кіроўцы майго Uber чакаюць, калі я ўвайду ўнутр», — напісаў адзін з карыстальнікаў TikTok. «Гэта элементарныя правілы этыкету — чакаць, пакуль іншы чалавек зойдзе ў дом», — дадаў іншы. Трэці сказаў, што дзяўчат неабходна праводзіць да дзвярэй, каб яны адчувалі сябе ў бяспецы. («— Выдатны вечар, можа, зойдзем да мяне выпіць кавы?» — «Ну, я нават не ведаю, кава на ноч неяк...» — «Калі ласка! У мяне не было кавы ўжо паўгода!»)

Іншая блогерка ацаніла заручальныя пярсцёнкі пасля няўдалых шлюбаў па дзесяцібальнай шкале. («Чаму ў Індыі самыя моцныя шлюбы? Ды таму, што на вяселлі жаніху дораць стрэльбу, а нявесце на лбе малююць чырвоную кропку».) На размешчаных у сетцы кадрах жанчына спачатку паказала сваю руку без ювелірнага ўпрыгажэння і ацаніла яе ў нуль балаў, патлумачыўшы, што яе першы муж быў «маладым, дурным і згубленым» і таму зрабіў ёй прапанову без пярсцёнка. («— Бэрымар, што гэта за выццё на балотах?» — «Вы так і не звазілі сваю бабу на мора, сэр».) Далей яна паказала залатое ўпрыгажэнне з каменем і прысудзіла яму адзін бал, бо лічыць яго «выродлівым, як сэрца і душа былога жаніха». Другі пярсцёнак, цалкам абсыпаны каштоўнымі камянямі, гераіня ролiка ацаніла ў тры балы і назвала занадта безгустоўным. Трэцяму з вялікім дыяментам жанчына дала восем балаў. «Ён залішне вытанчаны, але мой любімы», — апісала яна ювелірны выраб. («— Дарагі, а золата ржавее?» — «А адкуль такія пытанні?» — «Ды вось нешта з упрыгажэннямі, якія ты мне на юбілей падарыў...» — «Так, ёсць такія асобныя віды золата!») Карыстальнікі сеціва раскрытыкавалі паводзіны блогеркі. «Колькі вам яшчэ трэба атрымаць заручальных пярсцёнкаў, каб зразумець, што вы — усяго толькі часовы этап у жыцці любога мужчыны?», «У мяне нават аднаго вясельнага ўпрыгожвання няма», — выказваліся яны.

...За лжывы данос на мужа жыхарка Чарапаўца атрымала тры гады ўмоўнага пазбаўлення волі з такім жа выпрабавальным тэрмінам. Яна агаварыла мужчыну з-за рэўнасці. («Заўважана, што жанчына нашмат уважлівей слухае мужчыну, калі падчас размовы згадваць любое жаночае імя».) Мінулай зімой яна нападпітку пасля сваркі з мужам вырашыла агаварыць яго. Звярнулася ў праваахоўныя органы і заявіла пра цяжкія злачынствы, нібыта здзейсненыя мужам супраць падчарыцы. («Не бойцеся разумных жанчын. Калі прыходзіць каханне, мозг у іх адключаецца».) Сваю дачку зламысліца падгаварыла пацвердзіць ілжывыя звесткі. Пры праверцы заяўленае не пацвердзілася. Жанчына прызналася ў агаворы, адпаведнае тлумачэнне дала і яе дачка. Дзяўчынкі — яны такія... («Пэтэлефанавала былому і пачула ад яго: «Якая ж ты сцерва!» З замілаваннем падумала: «Не забыў... Памятае!»)

**Кастусь ХАЦЕЛАЎ-ЗМАГЕЛАЎ.**

# «Стварэнне песні — як нараджэнне дзіцяці»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)*

Спявак з'яўляецца членам народнага клуба паэтаў і кампазітараў «Жывіца», якім кіруе Ірына Карнавухава. Сюды, упэўнены саліст, прымаюць таленавітых і дастаткова моцных паэтаў, сярод іх — і Алена Харавец, і Канстанцін Цыбульскі, і Алена Радкевіч, і Уладзімір Супрановіч, і многія іншыя творцы. Так, аўтар Святлана Война напісала песню «Клавішы лёсу», якую на адной з сустрэч клуба пачуў Валерый, твор адразу запаў у сэрца спевака.

— Не кожны паэт можа табе даць песню, напрыклад, з нашай «Жывіцы». Я ж змагу падарыць гэтай песні жыццё, усё ж такі я артыст, збіраю людзей і за шэсць гадоў заняў сваю нішу. Святлана падарыла мне яе, і цяпер «Клавішы лёсу» радуюць слухача на маіх канцэртах.



Разам з Надзеяй Мікуліч.

Валерыю Каняхіну прыемна, калі людзі гавораць, што добра знаёмыя з яго творчасцю. Да таго часу, дадае артыст, пакуль ён не стаў аўтарам-выканаўцам, яго ніхто не ўспрымаў. Падчас работы ў рэстаране Валерый быў звычайным каверам-выканаўцам, у яго рэпертуары было 380 песень, але ні на адну ён не меў права. «Часам справа даходзіла да незмыкання звязак — прыходзілася звяртацца да фаніятара», — згадвае вакаліст.

У 2017 годзе Валерый Каняхін перамог на рэспубліканскім фестывалі аўтарскай песні «На доўгім бродзе» з кампазіцыяй «Сябрам». Гэта песня стала для яго сімвалічнай, з ёй артыст аб'ездзіў палову Беларусі.

— Сябры — гэта мой непарушны граніт, мне так пашанцавала, што ёсць годныя людзі, якія не здраджваюць, — гаворыць Валерый. — Прасіў паэтаў напісаць мне песню пра сяброўства, але яны не маглі перадаць тую сімвалічнасць, якую мне хацелася б апісаць. І ў адзін цудоўны дзень на мяне спусціўся дар нябесны, і нарадзіўся верш.

Валерый увесь час у думках пра творчасць, пра новыя песні і, вядома, прыгожыя касцюмы, якія шые дызайнер-мадэльер Святлана Несцяровіч. Артыст удзячны за работу сваім аранжыроўшчыкам Дзіму Брэгету, які жыве ў Лоеве, і Расціславу Галагану з Украіны, асабістаму ўрачу Лары Патапенцы — яны гатовы прыйсці на дапамогу ў любы час сутак.

— Я вельмі мала сплю — трычатыры гадзіны. Калі па вуліцы іду і лаўлю чый-небудзь позірк, значыць, чалавек падумаў, што я, мабыць, звар'яцелы: у маёй галаве ўвесь час мелодыі, — смяецца вакаліст.

Усе ўласныя песні для Валерыя як дзеці, а ў творчай скарбонцы Каняхіна іх каля 30, яны змясціліся ў тры асобныя дыскі. За плячыма артыста — шэраг сольных канцэртаў у сталіцы, прычым з аншлагамі. Ён лічыць, што ў кожнага — свой глядач.

— Да мяне прыйдзе мая зала, — гаворыць творца. — Калі я рабіў свой першы канцэрт, трэба было сабраць 150 чалавек, вельмі хваляваўся, што не прыйдзе патрэбная колькасць. А сабраў 260. Параўнаем: на першы канцэрт Міхаіла Круга прыйшло ўсяго 15 чалавек. А ў мяне столькі! — радуецца Валерый.

З-за пандэміі спявак не рабіў традыцыйны канцэрт у мінулым лістападзе. Аднак сёлета прыхільнікаў творчасці Валерыя Каняхіна чакаюць два сольнікі ў Мінскім раёне.

— Гледача не падманеш, ніколі не дазваляю сабе працаваць пад «фанеру». Рыхтуюся два месяцы перад канцэртам, гэта штодзённыя рэпетыцыі.

Калі б майму герою сказалі, што праз колькі гадоў ён стане аўтарам-выканаўцам, членам саюза пісьменнікаў Паўночнай Амерыкі, членам Беларускага саюза музычных дзеячаў, членам народнага клуба кампазітараў і паэтаў «Жывіца», што ён будзе выступаць на «Славянскім базары — 2019» як саліст ад Масквы, не паверыў бы. А сёлета Валерый Каняхін атрымаў яшчэ адно пацвярджэнне свайму таленту і прафесіяналізму — дыплом лаўрэата І ступені Міжнароднага фестывалю «Давайте воскликать!», прысвечаны памяці Булата Акуджавы, які арганізаваў саюз аўтараў Масквы.

— Колькі там было моцных канкурсантаў з Германіі, Польшчы і іншых краін! Я не думаў ні пра якое месца — проста хацеў, каб яшчэ раз мільганула маё прозвішча, пачулі мой голас, маю песню, мне гэта было дастаткова. І я быў у шоку, калі даведаўся, што заняў першае месца.

Наш герой параўноўвае стварэнне песні з нараджэннем дзіцяці. Калі ён піша словы да яе, заўсёды ўзнікае пэўны сілуэт, потым карцінка, пакрысе пачынае развівацца тэма.

— Ёсць у мяне шмат вершаў, але я часам разумею, што многа пустых слоў, нешта не падабаецца. Гэтыя творы павінны паляжаць прыкладна паўгода. Іх нават трэба забыць, каб потым нешта ў іх памяняць. Я з'яўляюся аўтарам усёй музыкі да сваіх песень, аднак словы да іх не толькі мае, але і членаў Саюза пісьменнікаў: гэта Алена Харавец, Канстанцін Цыбульскі, Уладзімір Супрановіч, Уладзімір Матусевіч, Таццяна Волкава, Алена Радкевіч, Святлана Войтава.

Музычны талент, лічыць Валерый, перадаўся яго гадавалай дачушцы Аліне. У тыя рэдкія хвіліны, што спявак праводзіць з сям'ёй, ён разумее, што гэты час бясцэнны.

— З роднымі я знаходжуся вельмі мала, Аліначка, калі прыходжу, паўзе да мяне, крычыць «Тата!» і не адпускае. Дачка — гэта такі маленькі дыяменцік, смарагд, у якім я бачу сябе, адчуваю, як яна падобная да мяне. Бяру ў рукі гітару і спяваю дачушцы песні, а яна засынае. Вельмі хацелася б, каб яе абмінула жыццё артысткі. Але музычную школу яна павінна скончыць — усялякае бывае ў жыцці! *(Смяецца.)*



Пасля канцэрта з роднымі і сябрамі.

**Надзея ЗУЕВА.**
**Фота з архіва спевака.**

ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 12
ад 19 лютага 2009 года выдадзена
Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Заснавальнікі газеты —
рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»,
грамадскае аб'яднанне «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі».
Дырэктар — галоўны рэдактар
КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

Адказныя за выпуск: рэдактар аддзела
Надзея НІКАЛАЕВА, рэдактар аддзела Сяргей РАСОЛЬКА.
Выдавец — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом "Звязда"».
Адрас рэдакцыі: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А.
Кантактныя тэлефоны: 292 44 12, 311 17 41.
e-mail: info@zviazda.by
Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
ЛД №02330/0494179 ад 03.04.2009.
220013, г. Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1.
Тыраж 14.804.
Нумар падпісаны ў 19.30 29.09.2021 г.

Афіша

# НА БАРДАЎСКІМ ФЭСЦЕ ВЫСТУПАЦЬ З... 10 ГАДОЎ!

**Найстарэйшы ў Беларусі адкрыты фестываль аўтарскай песні, паэзіі і візуальных мастацтваў «Віцебскі лістапад» сёлета пройдзе трыццаць пяты раз з 15 да 17 кастрычніка і традыцыйна ў канцэртнай зале «Віцебск». Сярод краін, чые жыхары стануць сёлета «лістападаўцамі», — Беларусь, Ізраіль, Латвія, Новая Зеландыя, Расія, Украіна.**

Арганізатары бардаўскага фэсту некалькі гадоў таму пашырылі рамкі, праект стаў шматвектарным, шматгранным у жанрах, адпаведна разлічаных на параўнальна большую глядацкую аўдыторыю.

Як і летась, культурная акцыя адбудзецца ў двух фарматах — рэальным і віртуальным. Тыя, хто прыедзе на малую радзіму Марка Шагала, зноў акунуцца ў душэўную атмасферу форуму, а ў каго не будзе такой магчымасці, змогуць стаць удзельнікам на адлегласці.

Фестываль адкрыецца паэтычным турнірам. Дарэчы, некалькі перыядычных выданняў і выдавецтваў ужо гатовыя друкаваць творы ўдзельнікаў.

Увечары таго ж дня адбудзецца адкрыццё персанальнай выстаўкі «Верш і я» Валянціны Ляховіч. Яна — адна з самых вядомых віцебскіх мастачак. Знакамітая тым, што выкарыстоўвае рэчы, больш непатрэбныя людзям, і стварае аб'екты ў вельмі папулярнай у наш час «смеццевай скульптуры». Будзе прадстаўлены і жывапіс розных фарматаў: тэмперны і алейны, акварэль... Прэзентацыя не выстаўкі пачнецца ў паўцемры. А вельмі крэатыўны віцебскі маладзёжны тэатр «Кола» дапаможа мастачцы гульнёй ценяў і іншым «звычайным чараўніцтвам» заінтрыгаваць публіку, нават далёкую ад успрымання сучаснага мастацтва.



Датычна галоўнага кірунку фэсту — аўтарскай песні — сёлета арганізатары вырашылі панізіць узроставую планку ўдзельнікаў бардаўскага конкурсу да 10 гадоў. Як растлумачылі карэспандэнту «Звязды» на прэс-канферэнцыі, у Беларусі аўтарская песня маладзее, да таго ж у краіне праводзяць дзіцячыя фэсты, у тым ліку ў рамках дарослых бардаўскіх праектаў. Таму прыйшоў час даць магчымасць выступіць хлопчыкам і дзяўчынкам і на найстарэйшым праекце ў краіне.

Падчас «Віцебскага лістапада» плануецца майстар-клас па гітары ад аднаго з беларускіх мэтраў. Ён падкажа, як правільна аранжыраваць песню, падабраць акампанемент, якія могуць быць памылкі...

Лаўрэаты ўсіх намінацый і ўладальнік галоўнай узнагароды «Прызнанне» выступяць на гала-канцэрце 16 кастрычніка.

Паэтычная вечарына «Ключ ад сёмага неба» стане фінальным акордам юбілейнага фестывалю 17 кастрычніка.

Па традыцыі Цэнтр культуры «Віцебск» (арганізатар праекта) дае прыхільнікам форуму магчымасць атрымаць спецыяльную акрэдытацыю. Яе ўладальнік мае права наведаць усе мерапрыемствы, уключаючы конкурсныя, а таксама выступіць у фармаце свабоднага мікрафона ў «Вулічным кафэ». Так! Ёсць такая незвычайная магчымасць у гледачоў стаць удзельнікам: прачытаць свае вершы або любімыя чужыя, пагутарыць з удзельнікамі фестывалю.

Напрыканцы яшчэ пра нязвычнае. Падчас гутаркі з журналістамі ў «Арт-прасторы» (на вуліцы Талстога, 7), адным з філіялаў музея «Віцебскі цэнтр сучаснага мастацтва», дзе былі прадстаўлены работы спадарыні Ляховіч, да арганізатараў далучылася... котка. Шмат хто чуў пра пiцерскiх эрмітажных хвастатых і вусатых — аказваецца, ёсць і ў гэтай установе культуры такая супрацоўніца. Вельмі далікатна вяла сабе на прэс-канферэнцыі, не скінула нічога са стала, на якім ляжалі паперы спікераў, нават лісцікаў клёну, якімі ўпрыгожылі інтэр'ер. Аўтара гэтых радкоў, праўда, падсядзела: заняла яго крэсла, калі яе ж і фатаграфаваў. А мянушка яе... Палітра! Безумоўна, яна стане адным з... арт-аб'ектаў фестывалю, які так хочацца пацiскаць і пагладзіць.

«Віцебскі лістапад» для тых, хто сюды трапіць упершыню, — магчымасць на некалькі дзён стаць бліжэй да мастацтва з вялікай літары. Пры гэтым заўсёды на фэсце дамашняя атмасфера, тут знаёмяцца, можна лёгка закахацца, і ўжо не рэдкасць, што праз шмат гадоў прыходзяць сюды з дзецьмі і ўнукамі. 35 — параўнальна вялікі тэрмін...

**Аляксандр ПУКШАНСКІ,**
**фота аўтара.**

Толькі факты!

# Яшчэ раз аб прышчэпках для тых, хто сумняваецца

**У Беларусі працягваецца вакцынацыя супраць COVID-19. На пытанні, якія часта ўзнікаюць у тых, хто яшчэ раздумвае, прышчапляцца ці не, адказала ўрач-эпідэміёлаг, загадчыца аддзялення імунапрафілактыкі аддзела эпідэміялогіі Мінскага абласнога цэнтра гігіены і эпідэміялогіі Марына КАЧКАН.**

***— Ці можа вакцына выклікаць захворванне на каранавірусную інфекцыю?***

— Не. «Спадарожнік V» і «Спадарожнік Лайт» утрымліваюць толькі S-бялок каранавіруса, а не цэлы вірус, кітайская вакцына VeroCell утрымлівае цалкам забіты вірус, таму размнажэнне каранавіруса з вакцыны ў арганізме чалавека немагчыма.

***— Ці варта прышчапляцца тым, хто перахварэў?***

— Так. Імунітэт пасля перанесенай інфекцыі не забяспечвае працяглую ахову. Пасля інфекцыі COVID-19, перанесенай бессімптомна або ў лёгкай ступені, вакцынацыю можна пачынаць адразу пасля поўнага выздараўлення. Калі захворванне перанесена ў сярэдняцяжкай або цяжкай форме, то прышчэпку мэтазгодна ўвесці праз 2—4 тыдні пасля выздараўлення. Можна адкласці вакцынацыю і на 3—6 месяцаў пасля захворвання, разлічваючы на постынфекцыйны імунітэт.

***— Ці трэба рабіць аналіз на антыцелы да SARS-CoV-2 ці ПЛР на наяўнасць каранавіруса перад вакцынацыяй?***

— Не. Абследавацца перад правядзеннем вакцынацыі на наяўнасць антыгена ці антыцелаў да віруса SARS-CoV-2 немэтазгодна, бо гэта не нясе ніякай канкрэтнай інфармацыі для прыняцця рашэння. Пры гэтым перад прышчэпкай праводзяцца апытанне і агляд пацыента ўрачом, пасля чаго ён дае дазвол. Абавязкова знаходжанне прышчэпленага каля працэдурнага кабінета на працягу 30 хвілін для назірання за рэакцыяй на прышчэпку.

***— Ці трэба выконваць самаізаляцыю пасля вакцынацыі?***

— Неабходнасці ў гэтым няма. Вакцына не ўтрымлівае патагенны для чалавека вірус, які выклікае COVID-19, таму захварэць і заразіць навакольных пасля прышчэпкі немагчыма.

***— Ці можна пасля вакцынацыі хадзіць без маскі?***

— Нельга. Ва ўмовах цыркуляцыі каранавіруснай інфекцыі і адсутнасці дастатковага ўзроўню калектыўнага імунітэту неабходна працягваць выконваць усе прафілактычныя меры. Важна разумець, што прышчэпка не дае стапрацэнтнай гарантыі, што вы не заразіцеся каранавірусам. Аднак дакладна ўстаноўлена, што вакцынацыя на 100 % абараняе ад цяжкага працякання хваробы і смяротнага зыходу.

Нагадаем, што для прафілактыкі каранавіруснай інфекцыі ў Беларусі выкарыстоўваюцца вакцыны Гам-Кавід-Вак (вектарная) вытворчасці РФ (гандлёвая марка «Спадарожнік V»); вакцына супраць SARS-CoV-2 (Vero Cell), інактываваная, вытворчасці КНР; вакцына «Спадарожнік Лайт» (вектарная) вытворчасці РФ. Усе вакцыны прымяняюцца ў асоб ва ўзросце 18 гадоў і старэйшых. Вакцынацыя праводзіцца бясплатна.

«Спадарожнік V» уводзіцца двухразова з інтэрвалам тры тыдні (але магчыма яго павелічэнне да 90 дзён). Эфектыўнасць вакцыны складае больш за 90 %. Чакаецца, што імунітэт фарміруецца на два гады, пакуль даказана, што ён захоўваецца 6—9 месяцаў.

Vero Cell уводзіцца двухразова з інтэрвалам 21—28 дзён (магчыма яго павелічэнне да 56 дзён). Эфектыўнасць складае больш за 70 %.

«Спадарожнік Лайт» уводзіцца аднаразова. Эфектыўнасць складае каля 80 %. Чакаецца, што імунітэт пасля вакцынацыі пратрымаецца 4—5 месяцаў. Гэта вакцына рэкамендавана Міністэрствам аховы здароўя да выкарыстання ў першачарговым парадку для студэнтаў, курсантаў, навучэнцаў дзённай формы навучання ўстаноў адукацыі, асоб, якія прызваны ці прызываюцца ў 2021 годзе на тэрміновую ваенную службу; у наступным парадку — для асоб, якія перахварэлі COVID-19 і раней не былі прышчэплены супраць каранавіруснай інфекцыі.

Урач-эпідэміёлаг звяртае ўвагу, што не трэба забываць і пра грып. Для яго прафілактыкі сёлета будуць выкарыстоўвацца вакцыны «Грыпол Плюс» (інактываваная суб'едынічная) вытворчасці РФ і «Ваксігрып Тэтра» (інактываваная чатырохвалентная спліт-вакцына) вытворчасці Францыі (платна). Абедзве вакцыны ўтрымліваюць аднолькавы склад антыгенаў віруса грыпу ў адпаведнасці з рэкамендацыямі СААЗ на бягучы эпідэмічны сезон, толькі «Ваксігрып Тэтра» — на адзін штам віруса грыпу больш. Імунітэт пасля вакцынацыі развіваецца праз 14—21 дзень і забяспечвае абарону на працягу 8—12 месяцаў.

Дарэчы, за апошнія 10 гадоў штогадовы ахоп прышчэпкамі супраць грыпу павялічыўся ўдвая — з 20 да 40 %, у выніку назіраецца выразная тэндэнцыя зніжэння захворвання.

Ва ўмовах правядзення вакцынацыі супраць каранавіруснай інфекцыі і супраць грыпу рэкамендуецца першачаргова прышчапіцца супраць каранавіруса, а праз 14 дзён пасля другой прышчэпкі — ад грыпу. Магчыма і сумеснае (у адзін дзень) прымяненне вакцын супраць COVID-19 і супраць грыпу — пры жаданні пацыента і афармленні яго пісьмовай згоды.

**Алена КРАВЕЦ.**

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

**Организатор электронных торгов:** закрытое акционерное общество Банк ВТБ (Беларусь), 220007, г. Минск, ул. Московская, д. 14, тел. +375339037951.
**Оператор электронной торговой площадки:** ОАО «Белорусская универсальная товарная биржа».
**Торги проводятся 09.11.2021 г.** на электронной торговой площадке «БУТБ-Имущество», **www.et.butb.by.**
**Время торгов** устанавливается инструментарием площадки в автоматическом режиме.

| № лота | Наименование предмета торгов; его местонахождение | Краткая характеристика | Начальная цена лота, бел. руб. | Сумма задатка, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| 1 | **Капитальное строение; г. Костюковичи, участок № 1** | Наименование: склад-навес. Назначение: здание специализированное иного назначения. Составные части и принадлежности: здание склада-навеса. Число этажей – 1, год постройки – 1990 | 71 600,00 | 7 160,00 |

**Продавец:** *ЗАО Банк ВТБ (Беларусь), Республика Беларусь, 220007, г. Минск, ул. Московская, д. 14; тел.: +375339037951, +375295005655, KlimovichAV@vtb-bank.by, Ziniuk@vtb-bank.by*

**Окончание приема заявлений на участие в торгах с прилагаемыми к ним документами** – 03.11.2021 г. до 15.00.

**Задаток** для участия в торгах перечисляется на текущий (расчетный) банковский счет № BY60AKBB30120000066940000000 в ОАО «АСБ Беларусбанк» в г. Минске, код AKBBBY2X, УНП 190542056, получатель платежа – ОАО «Белорусская универсальная товарная биржа».

**Срок внесения задатка** – не позднее даты и времени окончания приема заявлений на участие в торгах. **Назначение платежа**: внесение суммы задатка для участия в электронных торгах рег. № ___ по заявлению № ___.

**Сроки возмещения затрат на организацию и проведения торгов:**
*Победитель (единственный участник) торгов в течение 10 рабочих дней после утверждения протокола о результатах торгов обязан возместить затраты на организацию и проведение торгов, иные платежи, указанные в протоколе.*

**Сроки и условия заключения договора:**
*срок подписания договора купли-продажи недвижимого имущества и аренды земельного участка – не позднее 2 рабочих дней со дня возмещения вышеназванных затрат, иных платежей, указанных в протоколе о результатах торгов.*

**Брестский филиал**
**РУП «Институт недвижимости и оценки»**
**ИЗВЕЩАЕТ О ВНЕСЕНИИ ИЗМЕНЕНИЙ**
**в извещение о проведении аукциона по продаже имущества**
**ОАО «Брестторгтехника»**
**следующего содержания**

Аукцион состоится **20 октября 2021 г. в 11.00** по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-325, Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10, каб. 329 в рабочие дни с 9.00 до 17.00.
Последний день приема заявлений – **19 октября 2021 г.** до 17.00

Телефоны для справок: 8 (0162) 40-87-01, 40-87-02, Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

Ранее извещение о продаже имущества ОАО «Брестторгтехника» опубликовано в газете «Звязда» от 01.09.2021

УНП 201028245

Малая радзіма

# Гісторыя вёсак на валунах

Касцёл у Рубяжэвічах.



**Ансамбль «Памяць у камені» быў створаны на Стаўбцоўшчыне пятнаццаць гадоў таму. Яго ўрачыстае адкрыццё было прымеркавана да значнай падзеі ў мясцовым жыцці — 100-годдзя закладкі першага каменя пад будаўніцтва касцёла Святога Юзафа ў вёсцы Рубяжэвічы.**

— Мы хацелі пакінуць памяць пра наша пакаленне. Параіліся з прыхаджанамі, святаром, усе падтрымалі ідэю. Яна была ў наступным: у 2006 годзе ў парафіі касцёла Святога Юзафа налічваліся 43 вёскі. Мы прапанавалі, каб жыхары кожнай з іх прывезлі вялікі камень да храма. І яны адгукнуліся, выбіралі толькі самыя прыгожыя валуны. Мы вызначылі месца для ансамбля праз дарогу насупраць касцёла. Камяні расставілі так, як на карце Беларусі размешчаны гэтыя населеныя пункты. На кожным напісалі назву вёскі. Былі і цяжкасці. Напрыклад, Васілеўшчына раней называлася Жыдавічамі. Якую назву выбіць на валуне? Жыхары раіліся і нават спрачаліся. Але ўрэшце прыйшлі да высновы, што на камені будуць дзве назвы. Вёскі злучаны дарогамі з пяску і вядуць да цэнтральнай. А яна ў сваю чаргу — да сімвала хрысціянскай веры — крыжа. Дарога выкладзена камянямі, бо касцёл наш каменны, — расказала былая настаўніца мясцовай школы, **экскурсавод Рамуальда САБАЛЕЎСКАЯ.**





## З НАДЗЕЯЙ І ЛЮБОЎЮ

Паблізу памятнага знака вернікі выкапалі штучнае азярцо, якое перыядычна запаўняюць вадой. Паставілі ўмоўны калодзеж-жураўель — сімвал роднай дзедавай хаты. Побач паклалі чатыры вялікія камяні, на якіх выбіты словы: «Вёска жыве з верай, надзеяй і любоўю».

Свята сабрала шмат людзей, нават тых, хто даўно з'ехаў у іншыя мясціны.

— Пасля ўрачыстасцяў, як бывае, пачаліся развагі: а ці патрэбна гэта было. Але, як кажуць, час — найлепшы суддзя. Пасля мы зразумелі, што зрабілі вельмі добрую справу,— кажа Рамуальда Сабалеўская. — Напрыклад, у вёсцы Ліхачы ў 2006 годзе жыў толькі адзін Юра Сіман. Не стала Юры, хтосьці спаліў яго хату, зараз там калгаснае поле. І нават дарога, якая вяла да падворку, стала зарастаць. Пройдзе час, і, можа, яна зусім знікне. А вёска не знікла, запрашае: калі ласка, прыходзьце, мае жыхары. І людзі прыходзяць да валуноў, нібы дадому, асабліва падчас вялікіх свят. Пасля малітвы ў касцёле хрэсным ходам ідзём на могілкі, памінаем продкаў. Прайшло толькі 15 гадоў, а лёс вёскі Ліхачы напаткаў яшчэ два населеныя пункты: зніклі Масалі і Грань. З цягам часу многія вёскі застануцца толькі тут, у ансамблі «Памяць у камені».

## З ПАВАГАЙ ДА ІНШАЙ ВЕРЫ

Зразумела, Рубяжэвічы ўжо не стануць тым мястэчкам, якім былі да Вялікай Айчыннай вайны, калі там пражывалі тры тысячы чалавек: беларусы, палякі, рускія, але большасць складалі яўрэі — 2000. Менавіта яны заснавалі мястэчка дзесьці ў 1530 годзе. Тут былі дзве сінагогі — зімовая і летняя, два каталіцкія касцёлы — Святога Антонія і Святога Юзафа, праваслаўны храм Мікалая Цудатворца.

— Нягледзячы на сваю шматканфесійнасць вяскоўцы, паводле аповедаў старажылаў, жылі згуртавана і дружна, — падкрэслівае Рамуальда Сабалеўская. — Ніхто ні разу не задаў пытання іншаму, маўляў, якой ты нацыянальнасці. Зрэшты, гэтая павага да іншай веры, рэлігіі засталася і сёння. Як і раней, жыхары сябруюць паміж сабой, дапамагаюць адно аднаму, калі здарылася бяда, і радуюцца — калі ўсё добра. Незалежна ад таго, католік ты ці праваслаўны. Ёсць і змешаныя сем'і. Але розная вера не перашкаджае адзначаць ім святы як праваслаўныя, так і каталіцкія.

— Так у нашай вёсцы было заўсёды, — працягвае жанчына. — Мой свёкар расказваў: «Закончыцца служба ў касцёле, шмат народу ідзе па вуліцы. Яўрэі запрашаюць у свае лаўкі, крамы. А калі хтосьці казаў, што не мае грошай, то яму ў адказ — нічога, потым разлічышся. Зойдзем з хлопцамі, возьмем чацвярцінку гарэлкі. Але не ад колькасці выпітага п'янія. Што для нас, маладых мужчын, тая кропля. П'янія ад уражанняў, ад навін, якія пачулі. І гэтым жывём увесь тыдзень, да наступнай службы».

Сёння ў Рубяжэвічах жыве толькі 130 чалавек, пераважна старэйшага ўзросту. Калі хтосьці з іх адыходзіць у іншы свет, то ўсе смуткуюць, развітваюцца як з родным, бо разумеюць: адыходзіць эпоха.

## БЕЛАРУСКІ НОТР-ДАМ

Праз дарогу ад ансамбля «Памяць у камені» каля сцяны касцёла Святога Юзафа ляжыць вялікі камень Антонія Тура, які непасрэдна звязаны з гісторыяй будаўніцтва святыні. Пасля апошняга падзелу Рэчы Паспалітай Рубяжэвічы ўвайшлі ў склад Расійскай імперыі. Касцёл быў перабудаваны ў праваслаўны храм. Амаль восем тысяч вернікаў засталіся без сваёй святыні. І вось знайшоўся чалавек, які задумаў пабудаваць каталіцкі храм. Гэта быў мясцовы жыхар Антоній Тур. Ён пісаў прашэнні імператару, тры разы хадзіў у Пецярбург. І кожны раз атрымліваў адмову. У 1866 годзе Антоній прывёз на пясчаны ўзгорак валун, на якім напісаў: «Тут будзе пабудаваны каталіцкі касцёл» і паставіў свае ініцыялы. За такое самавольства яго разам з сям'ёй на дванаццаць гадоў саслалі ў Сібір.

На пачатку 1905 года ён зноў ідзе ў Пецярбург і нарэшце атрымлівае дазвол ад расійскага самадзержца на ўзвядзенне храма з умовай кіравацца ўсімі загадамі мінскага губернатара. Той, у сваю чаргу, дае распараджэнне будаваць касцёл з часанага каменю. Касцёл павінен быць вялікіх памераў, а ўзвесці яго неабходна за чатыры гады. Быў распрацаваны прыгожы праект будучага храма. Вернікі разумелі, што за такі кароткі час яны не справяцца, і прынялі рашэнне спрасціць архітэктуру: замест дванаццаці вежаў пакінуць дзве.

У 1906 годзе парафіяне выкапалі вялікі катлаван для падмурка, клалі туды дубовыя палены, камень. Раствор замешвалі на яйках, малацэ і вапне з даданнем невялікай колькасці пяску. Затым катлаван засыпалі, работы спынілі на год. У 1907-м зноў пачалося актыўнае будаўніцтва. Кожны дзень на будоўлі шчыравала 100 работнікаў, акрамя гэтага, у радыусе ад 10 да 15 кіламетраў працавала 50 каменячосаў. Гатовыя камяні прывозілі на будоўлю конямі. Шэсць конных кранаў падымалі іх наверх. А вежы, куды цяжка было дабрацца рабочым, узводзілі з дапамогай лябёдак. Майстар Цыпрыян Трызна крыў вежы і ладзіў на іх крыжы. Паставіўшы другі крыж, мужчына падняўся на яго і, развёўшы рукі ў бакі, з 45-метровай вышыні засведчыў, што будаўніцтва касцёла скончана.

— З таго самага часу па сённяшні дзень храм не меў іншага прызначэння. Ці то была вайна, ці гады ліхалецця, ці атэістычны час, ён заўсёды дзейнічаў, бо быў узведзены з вялікай любоўю, — лічыць Рамуальда Сабалеўская.

Людзі ахвяравалі на будаўніцтва хто што мог. І нават тыя землякі, што былі на заробках у Амерыцы, частку грошай адпраўлялі на будаўніцтва святыні. Вялікую фінансавую дапамогу аказалі і ўладальнікі сядзібы Сула князі Ленскія. А жанчыны з Рубяжэвічаў і навакольных вёсак гатавалі для будаўнікоў ежу. Як згадвалі старажылы, дзеці часта прасілі маці сасмажыць яечню, але жанчыны казалі малым: «Пабудуем храм, тады і яечню будзем есці». Бо кожнае яйка было на ўліку, каб накарміць тых, хто працаваў на будоўлі.

У Рубяжэвічы часта прыязджаюць экскурсіі з усёй Беларусі. Касцёл наведваюць не толькі каталіцкія вернікі, але і праваслаўныя, каб дакрануцца да прыгожага, паслухаць арганны канцэрт. Асабліва ўражвае слухачоў песня Булата Акуджавы «Малітва». Гэты арган у 1928 годзе прывезлі па частках з Вільні на дванаццаці падводах. А нядаўна тут з'явілася фісгармонія 1870 года выпуску. Яе адрамантаваў муж Рамуальды Сабалеўскай. І інструмент загучаў дзівоснай музыкай.

У касцёле таксама знаходзіцца ікона Божай Маці Вастрабрамскай, якую падарыла маці Янкі Купалы Бянігна Луцэвіч. Дарэчы, усе сваякі паэта па мацярынскай лініі пахаваныя на могілках у Рубяжэвічах.

**Тацяна ЛАЗОЎСКАЯ.**
**Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.**

Гэта цікава

# КВЭСТ У ПАРКУ «ПЕРАМОГА»

### Маладзечанская бібліятэка з дапамогай квэстаў расказвае пра гісторыю Вялікай Айчыннай вайны

**Прагульваючыся ў гарадскім парку Маладзечна, цяпер час ад часу можна назіраць цікавае відовішча: купкі маладых людзей альбо падлеткаў з аркушыкамі ў руках нешта горача абмяркоўваюць, бягуць, спыняюцца перад нейкімі аб'ектамі з радаснымі воклічамі... Не дзівіцеся, бо, калі даведаецеся, у чым справа, самім захочацца далучыцца.**



Пра вельмі важныя для выхавання рэчы можна расказваць дзецям і моладзі нефармальна і захапляльна... Гэта чарговы раз пацвердзілі супрацоўнікі Маладзечанскай цэнтральнай раённай бібліятэкі імя М. Багдановіча, якія ў межах праекта «Ідзі і глядзі» распрацавалі асаблівы квэст — «Мінулых гадоў жывая памяць»... Ён карыстаецца вялікім попытам і ў школьнікаў, і ў студэнтаў, і людзей старэйшых...

— Квэст праводзіцца на тэрыторыі гарадскога парку «Перамога», — распавядае **дырэктар бібліятэкі Марыя СТАСЯЛОВІЧ.** — У нашым парку вельмі шмат тэматычных помнікаў, і мы вырашылі з іх дапамогай пазнаёміць чытачоў з падзеямі Вялікай Айчыннай вайны, з гісторыяй нашага горада і роднай Беларусі. І, павінна сказаць, у нас амаль аншлаг. Праходзілі квэст навучэнцы Маладзечанскага дзяржаўнага медыцынскага каледжа імя І. В. Залуцкага і політэхнічнага каледжа, прадстаўнікі маладзечанскай арганізацыі грамадскага аб'яднання «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі», звяртаюцца да нас і сярэднія спецыяльныя навучальныя ўстановы, і школы, і не толькі гарадскія, але і з раёна.

Гульцы атрымліваюць спіс заданняў і маршрутны ліст і рухаюцца па пунктах. Гульня разлічана прыблізна на сорак хвілін. Трэба прайсці сем аб'ектаў. Квэст пачынаецца ад галоўнага ўвахода ў парк, далей давядзецца пабываць у алеі гарадоў, дзе праходзілі «Дажынкі», у алеі Герояў Савецкага Саюза, жыццё і дзейнасць якіх звязаны з Маладзечаншчынай, і нават успомніць, якія жывёлы дапамагалі савецкім войскам і партызанам у гады Вялікай Айчыннай вайны... Не абыходзіцца без тэмы знакамітага Маладзечанскага фестывалю беларускай песні і паэзіі. Шукаць адказ на адно з заданняў давядзецца ў амфітэатры, дзе адбываліся важныя падзеі гэтага музычнага фэсту. Каб выканаць заданне, трэба не проста дабрацца да пэўнага аб'екта, але і праявіць назіральнасць і кемлівасць. У квэсце ёсць інтрыга, бо гэта камандная гульня — звычайна ўдзельнікі падзяляюцца на дзве каманды. Пераможцы атрымліваюць ад бібліятэкі дыпломы. Напрыклад, калі спаборнічалі навучэнцы політэхнічнага каледжа, каманда «Васількі» перамагла каманду «Кветкі» з перавагай у чатыры балы.

Каб далучыцца да гульні, трэба звярнуцца ў бібліятэку. Умовы можна пачытаць на яе сайце і на сайце маладзечанскага гарвыканкама.

**Святлана ПЯТРОВА.**

# ПАЛЯВАННЕ НА АЛІГАРХАЎ



## Як ва Украіне змагаюцца з карупцыяй?



**Вярхоўная рада Украіны прыняла так званы закон пра алігархаў. Аўтарам ініцыятывы выступіў прэзідэнт Уладзімір Зяленскі, які паабяцаў выбаршчыкам пазбавіць краіну ад празмернага ўплыву мільярдэраў, паведаміла rt.com. Закон прадугледжвае стварэнне рэестра, куды будуць заносіцца алігархі, якія ўплываюць на сістэму дзяржкіравання, медыясферу і бізнес. Сцвярджаць «кандыдатаў» на трапленне ў спіс будзе Савет нацыянальнай бяспекі і абароны. Эксперты, у сваю чаргу, звярнулі ўвагу на размытасць фармулёвак, якія вызначаюць прыкметы для ўключэння заможных украінцаў у рэестр. На думку аналітыкаў, з аднаго боку, гэтым законам Зяленскі заляцаецца да Захаду, а з другога — стварае для сябе новы інструмент ціску на апанентаў. Як ва Украіне змагаюцца з карупцыяй?**

### ЗАБРУДЖВАННЕ ІМІДЖУ

Вярхоўная рада зацвердзіла законапраект 5599, накіраваны на барацьбу з украінскімі алігархамі на мінулым тыдні. За дакумент прагаласавалі 279 дэпутатаў, з іх 229 — члены фракцыі «Слуга народа». Таксама дакумент атрымаў падтрымку партый «Голас», «Давер» і «За будучыню». Афіцыйная назва ініцыятывы — закон «Аб папярэджанні пагроз нацыянальнай бяспекі, звязаных з празмерным уплывам асоб, якія маюць значную эканамічную ці палітычную вагу ў грамадскім жыцці (алігархаў)».

**Відавочна, што гэты дакумент накіраваны на тое, каб «адціснуць» вялікі бізнес. Такую заяву зрабіў у праграме «Народ супраць» на тэлеканале «Украіна 24» колішні прэм'ер-міністр Уладзімір Гройсман. «Усе і так ведаюць, хто ў краіне з'яўляецца алігархам. Гэта класічны фэйк, а не антыалігархічны закон», — заўважыла старшыня фракцыі «Батьkивщина» Юлія Цімашэнка.**

Сакратар Савета нацыянальнай бяспекі і абароны (СНБА) Аляксей Данілаў заявіў, што прыняцце закона пра алігархаў адкрывае новую старонку ў гісторыі Украіны. Паводле яго слоў, краіна «раз і назаўсёды павінна пазбавіцца ад кланава-алігархічнай сістэмы». «Гэтае пытанне станаўлення нашай краіны як дзяржавы і нашай будучыні. Ці будзе захоўвацца сітуацыя, калі дзясятак асоб канцэнтруюць у сваіх руках 90 працэнтаў нацыянальнага багацця, або мы паспрабуем пабудаваць дзяржаву роўных магчымасцяў і роўнага доступу», — напісаў Данілаў на сваёй старонцы ў «Фэйсбуку».

Як вядома, законапраект 5599 унёс у Вярхоўную раду 2 чэрвеня прэзідэнт Украіны. Праз некалькі дзён, выступаючы на форуме «Украіна 30. Экалогія», Уладзімір Зяленскі заявіў, што яго курс накіраваны на выкараненне ўплыву алігархаў на палітыку ў краіне і працэс прыняцця рашэнняў. Ён адзначыў, што калі заручыцца падтрымкай парламента, то гэта азначае, што на яго баку знаходзіцца і ўкраінскае грамадства. «Я не хачу, каб у нас былі алігархі. Больш за тое, праблема не толькі ў кіраванні эканомікай або ўздзеянні на палітыку Украіны ўнутры — гэта і вялікае палітычнае забруджванне іміджу Украіны за мяжой. Таму я ведаю, што за маю кадэнцыю мы пазбавімся ад усіх алігархаў. Я даваў слова, і я іду да гэтага», — сказаў Зяленскі.

### РЭЕСТР МІЛЬЯНЕРАЎ

Прэзідэнцкі законапраект прадугледжвае стварэнне рэестра асоб, чыя дзейнасць падпадае пад пэўныя прыкметы. Паводле зацверджанага алгарытму, спіс павінен складаць Савет нацыянальнай бяспекі і абароны на падставе прадстаўленняў кабінета міністраў і іншых органаў улады. Крытэрыямі для ўключэння ў рэестр з'яўляюцца ўдзел у палітычным жыцці, значны ўплыў на СМІ, бенефіцыярнае валоданне кампаніяй-манапалістам. Яшчэ адной прыкметай алігарха прызнаны капітал, які перавышае мільён пражытковых мінімумаў. Па цяперашнім часе гэты паказчык складае каля 2,3 млрд грыўняў (86,3 млн долараў).

Перад пасяджэннем СНБА з нагоды ўнясення ў спіс кандыдат, папярэдне прылічаны ўкраінскімі ўладамі да алігархаў, павінен атрымаць адпаведнае паведамленне. Па законе ён мае права даць тлумачэнні і іншыя дакументы. Асобам, якія апынуліся ў рэестры, забараняецца фінансаваць палітычныя партыі, у тым ліку праз пасрэднікаў, а таксама ўдзельнічаць або станавіцца бенефіцыярамі ў прыватызацыі буйных актываў. Тыя, хто быў прызнаны алігархамі, захоўваюць права ўзаемадзейнічаць з дзяржслужачымі, у той жа час яны павінны папярэджваць аб сваім статусе.

Сам рэестр будзе ўяўляць інфармацыйна-тэлекамунікацыйную сістэму. Акрамя звестак пра алігархаў, у яго будуць уносіцца дэкларацыі — інфармацыя аб кантактах грамадзян з імі або іх прадстаўнікамі. У абавязковым парадку даваць такія справаздачы павінны прадстаўнікі палітычнага кіраўніцтва краіны: прэзідэнт, спікер Вярхоўнай рады, дэпутаты, члены ўрада і іншыя чыноўнікі. У іх будзе выкладацца кароткі змест гутаркі, паказвацца дата і месца сустрэчы. Дэкларацыі неабходна падаваць не пазней за наступны дзень пасля кантакту.

Закон будзе дзейнічаць на працягу дзесяці гадоў. Як гаворыцца ў тэксце дакумента, яго мэтай з'яўляецца «пераадоленне канфлікту інтарэсаў, выкліканага зліццём палітыкаў, медыя і вялікага бізнесу, забеспячэнне нацыянальнай бяспекі Украіны ў эканамічнай, палітычнай і інфармацыйнай сферах, абарона дэмакратыі, забеспячэнне дзяржаўнага суверэнітэту».

**«Гэта вялікая карупцыя. СНБА, а, па сутнасці, сам Зяленскі будзе вырашаць, хто дрэнны, а хто добры. І адразу пачнецца: не хочаш быць дрэнным, значыць, бяры чамадан грошай і нясі на Банкавую [ў офіс прэзідэнта. — Рэд.]», — напісаў у «Фэйсбуку» дэпутат ад апазіцыйнай партыі «Еўрапейская салідарнасць» Аляксей Ганчарэнка.**

Незадоўга да прыняцця Вярхоўнай радай, у законапраект быў унесены шэраг змяненняў. Так, у дакуменце з'явілася паняцце «прадстаўнік алігарха», праўда, яно не было растлумачана. Акрамя гэтага, у тэксце абноўленага законапраекта быў пашыраны тэрмін «удзел у палітычным жыцці». Таксама ў рэестр будуць уносіцца даныя аб бізнесе і партыях, на якія алігархі аказваюць уплыў. Акрамя таго, удзельнікам спіса забаранілі фінансаваць агітацыйныя кампаніі і акцыі пратэсту.

### ПА ВОЛІ КЛАНАЎ

У працэсе разгляду законапраекта пра алігархаў была прапанавана 1271 праўка, але амаль усе гэтыя заўвагі не былі ўлічаныя. Перад галасаваннем упаўнаважаная Вярхоўнай рады па правах чалавека Людміла Дзянісава назвала гэты дакумент антыканстытуцыйным, паведаміла dw.com. Спікер парламента Дзмітрый Разумкоў раней накіраваў законапраект на экспертызу Венецыянскай камісіі, аднак парламенцкая большасць прыняла рашэнне зацвердзіць гэты дакумент, не чакаючы заключэння еўрапейскіх экспертаў.

Уяўная аднадушнасць парламенцкай залы ў прыняцці рэзананснага дакумента не павінна ўводзіць у зман, заўважыла «Бі-бі-сі». Гэты закон крытыкавалі не толькі традыцыйныя апаненты Уладзіміра Зяленскага, але і яго вядомыя паплечнікі. Спікер Вярхоўнай рады Дзмітрый Разумкоў заявіў, што Савет бяспекі, які ва ўкраінскім заканадаўстве апісваецца як дарадчы, кансультатыўны, каардынацыйны орган, наўрад ці ўдалы выбар у якасці «каральнага мяча», які адказвае за пошук алігархаў і ўключэнне іх у рэестр. «Гэта вялікая карупцыя. СНБА, а, па сутнасці, сам Зяленскі будзе вырашаць, хто дрэнны, а хто добры. І адразу пачнецца: не хочаш быць дрэнным, значыць, бяры чамадан грошай і нясі на Банкавую [ў офіс прэзідэнта. — **Рэд.**]», — напісаў у «Фэйсбуку» дэпутат ад апазіцыйнай партыі «Еўрапейская салідарнасць» Аляксей Ганчарэнка.

**Яшчэ адной прыкметай алігарха прызнаны капітал, які перавышае мільён пражытковых мінімумаў. Па цяперашнім часе гэты паказчык складае каля 2,3 млрд грыўняў (86,3 млн долараў).**

Як адзначыў rt.com прэзідэнт Цэнтра сістэмнага аналізу і прагназавання Расціслаў Ішчанка, дакумент накіраваны выключна на працяг палітыкі ўзурпацыі ўлады, якую праводзіць Зяленскі, і таму не прымаліся практычна любыя пярэчанні. «Гэты закон накіраваны на тое, каб даць магчымасць Зяленскаму засяродзіць у сваіх руках дыктатарскую ўладу. Калі спрабаваць аналізаваць крытэрыі ўключэння ў рэестр, то алігархам можна абвясціць любога багатага грамадзяніна Украіны», — растлумачыў Ішчанка.

Палітолаг перакананы, што ініцыятыва Зяленскага не мае ніякага дачынення да рэальнай перабудовы палітычнай сістэмы краіны, дзе з 1990-х гадоў галоўную ролю адыграе воля алігархічных кланаў. На думку Ішчанкі, зараз усе ўкраінскія высокапастаўленыя асобы, у тым ліку прэзідэнт, «знаходзяцца на сваіх месцах толькі дзякуючы алігархічнаму кансэнсусу». «Зразумела, што Зяленскі ніколі не будзе змагацца супраць тых, хто забяспечвае яго і яго каманду капіталамі, хто забяспечвае яму інфармацыйную падтрымку», — падкрэсліў Ішчанка. Эксперт лічыць, што закон пра алігархаў неабходны Зяленскаму як «дадатковая рэпрэсіўная мера». У найбліжэйшай будучыні, з пункту гледжання Ішчанкі, дакумент будзе выкарыстоўвацца як механізм для далейшага наступлення на палітычных праціўнікаў.

### КЛАСІЧНЫ ФЭЙК

Крыніца rt.com у офісе прэзідэнта патлумачыла матывацыю Зяленскага імкненнем быць пераабраным на другі тэрмін — ініцыяраваны ім закон дазволіць больш эфектыўна кантраляваць медыярэсурсы, якія належаць буйным бізнесменам. Акрамя гэтага, такім чынам украінскі лідар імкнецца прадэманстраваць Захаду, што выконвае абяцанне змагацца з уплывам алігархаў.

Пры гэтым суразмоўца rt.com у партыі «Слуга народа» прытрымліваецца іншай версіі. Дэпутат мяркуе, што закон пра алігархаў быў прыняты ў інтарэсах заходняга бізнесу, які спрабуе пазбавіць буйных украінскіх прадпрымальнікаў найбольш прыбытковых актываў і не дапусціць іх удзелу ў «вялікай прыватызацыі». «Чаму Захад так настойліва патрабуе ад Украіны пазбавіцца ад алігархаў? Таму што іх актывы павінны перайсці буйным міжнародным кампаніям з ЕС і ЗША. Захад атрымлівае ўкраінскую эканоміку, Зяленскі — паўнату ўлады. Усе дамовіліся», — заўважыў дэпутат.

Палітолаг Аляксандр Дудчак таксама мяркуе, што ініцыіраваны Зяленскім закон галоўным чынам накіраваны на задавальненне патрабаванняў заходніх эліт і транснацыянальных карпарацый. «У дадзеным выпадку гэта задавальняе глабальны капітал, таму што ён змагаецца з украінскімі алігархамі, але не як са злачынцамі, а як з канкурэнтамі», — растлумачыў эксперт.

Відавочна, што гэты дакумент накіраваны на тое, каб «адціснуць» вялікі бізнес. Такую заяву зрабіў у праграме «Народ супраць» на тэлеканале «Украіна 24» колішні прэм'ер-міністр Уладзімір Гройсман. «Усе і так ведаюць, хто ў краіне з'яўляецца алігархам. Гэта класічны фэйк, а не антыалігархічны закон», — заўважыла старшыня фракцыі «Батьkивщина» Юлія Цімашэнка, паведаміў glavcom.ua.

Даныя сацапытання, праведзенага летам Кіеўскім міжнародным інстытутам сацыялогіі, сведчаць, што ўкраінцы не надта вераць у магчымыя перамены. 56,4 працэнта рэспандэнтаў заявілі, што алігархам нічога не пагражае. Вось і ўсё «паляванне».

**Пётр ДУНЬКО.**

### ТЫМ ЧАСАМ

#### Адкрываецца новы фронт

*«Самае сумнае — гэта Украіна. У нас адкрываецца новы, па-старому кажучы, фронт*, — заўважыў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка, прымаючы кіраўніцтва сілавога блока з дакладам аб абстаноўцы на дзяржаўнай граніцы. — *Мы бачым, што яны твораць. Мала таго, што туды пабеглі нашы збеглыя, — там ствараюцца вучэбна-трэніровачныя лагеры ва ўсё большай колькасці, дзе навучаюць мэтанакіравана (і не толькі збеглых) рабоце па Беларусі, як кажуць спецслужбы»*, — заявіў Прэзідэнт.

Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што ўжо нават самі ўкраінскія пагранічнікі выяўляюць тайнікі са зброяй каля граніцы з Беларуссю. *«Калі гэтыя тайнікі для мерапрыемстваў на тэрыторыі Украіны, то іх не трэба цягнуць да нашай граніцы. Яны схавалі б недзе ў іншым месцы. Зразумела, мы бачым прыкметы нядобрых дзеянняў у адносінах да Беларусі. Аб гэтым ужо нямала сказана»*, — канстатаваў Прэзідэнт.

# ПРАВИЛА ПРОВЕДЕНИЯ РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ
# «Октябрь на Драйве! Мастеркард»

**1. Организатор Рекламной игры**
Организатором Рекламной игры является общество с ограниченной ответственностью «Рефорте», УНП 100422707 (далее – Организатор) с местом нахождения по адресу: 220030, Беларусь, г. Минск, пл. Свободы, д. 4, офисное помещение № 334. Электронный адрес: post@forte.by.
**2. Наименование и территория проведения Рекламной игры**
Рекламная игра имеет наименование «Октябрь на Драйве! Мастеркард» (далее – Игра) и проводится на территории автозаправочных станций предприятий по нефтепродуктообеспечению, входящих в Государственное производственное объединение «Белоруснефть» (далее – ПО «Белоруснефть»), находящихся в Республике Беларусь.
**3. Срок начала и окончания Игры**
Игра проводится с 01 октября 2021 г. по 13 декабря 2021 г. (включая срок выдачи выигрыша и опубликования результатов проведения Игры).
**4. Комиссия по проведению Игры**
Для проведения Игры Организатор утверждает комиссию по проведению Игры (далее – Комиссия) в составе 5 человек, в том числе председателя Комиссии.
Состав Комиссии:
1. Даниленко Валерий Михайлович – Управляющий ООО «Рефорте», председатель Комиссии;
2. Агеенко Наталья Анатольевна – заместитель директора по экономике и финансам ООО «Рефорте»;
3. Кричковская Светлана Владимировна – главный бухгалтер ООО «Рефорте»;
4. Даниленко Ольга Михайловна – специалист по рекламе ООО «Рефорте Групп»;
5. Чефанова Маргарита Игоревна – бухгалтер ООО «Рефорте».
**5. Наименование товаров/услуг, в целях стимулирования реализации которых проводится Игра**
Игра проводится в целях стимулирования использования банковских платежных карточек международной платежной системы Mastercard, эмитированных банками Республики Беларусь (далее – Карта Mastercard), за исключением карт Maestro и Белкарт/Maestro, для оплаты покупки топлива на автозаправочных станциях предприятий по нефтепродукто-обеспечению, входящих в ПО «Белоруснефть».
**6. Условия, при соблюдении которых физическое лицо становится Участником Игры**
6.1. К участию в Игре допускаются совершеннолетние (достигшие 18 лет) граждане Республики Беларусь, а также иностранные граждане и лица без гражданства.
6.2. Участником Игры не может быть лицо, состоящее в трудовых отношениях с Организатором, супруг (супруга) такого лица, его близкие родственники, а также лица, находящиеся с таким лицом в отношениях свойства, члены Комиссии.
6.3. Для участия в Игре необходимо выполнить следующие условия:
- в период с 01 октября 2021 г. по 31 октября 2021 г. включительно совершить не менее трех покупок топлива отдельными чеками в различные даты по Карте Mastercard, эмитированной банками Республики Беларусь, за исключением карт Maestro и Белкарт/Maestro, на АЗС сети ПО «Белоруснефть» на сумму не менее 1 (одного) белорусского рубля в каждом чеке с использованием зарегистрированной накопительной информационно-учетной карты Участника Игры (в дальнейшем – Карта «Заправка»), которая определяет физическое лицо как участника программы поощрения клиентов (физических лиц) ПО «Белоруснефть» (далее – Программа «Заправка»), проводимой на АЗС сети «Белоруснефть».
Зарегистрированной считается Карта «Заправка» при указании ее владельцем в анкете регистрации следующих достоверных данных: фамилии, имени, отчества (при наличии), даты рождения, номера мобильного телефона операторов сотовой связи в международном формате, населенного пункта, а также адреса электронной почты.
6.4. Участник Игры может участвовать в Игре только один раз независимо от количества и сумм совершенных покупок.
**7. Состав и размер призового фонда, источники его формирования**
Размер призового фонда игры составляет **34 058,05** (тридцать четыре тысячи пятьдесят восемь) белорусских рублей, 05 копеек.
Состав призового фонда:

| Наименование выигрыша (приза) | Количество, шт. | Общая стоимость призового фонда, бел. руб. |
|---|---|---|
| **Автомобиль: КИА RIO_FB**<br>Год выпуска: 2021<br>Цвет кузова: черный металлик стоимостью 29 650,00 белорусских рублей<br>и денежные средства в сумме 4 408,05 белорусских рублей, которые удерживаются Организатором для уплаты за Победителя подоходного налога с общей стоимости приза | 1 | **34 058,05** |

Источником формирования призового фонда Игры являются денежные средства и имущество Организатора.
**8. Проведение розыгрыша призового фонда**
**8.1. Место, дата и время проведения розыгрыша**
